ЛіМ

Літаратура і мастацтва

Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

№ 50 (5155) 17 снежня 2021 г. ISSN 0024-4686

16+

Абмяняцца творчымі энергіямі стар. 4

Волаты горада на Волзе стар. 10

Развітальны трыумф маэстра стар. 13

Нарачанская Чайка

Фота Кастуся Дробава.

Марыя Захарэвіч у спектаклі «Вольга» па п'есе фінскага драматурга Лаўры Руаханен.

Адметная зорка таленту Марыі Георгіеўны Захарэвіч запалілася ў Нарачанскім сузор'і асоб. Прырода Мядзельшчыны, яе людзі, карані продкаў і ёсць тая чыстая, бруістая крыніца, што натхніла і натхняе народную артыстку Беларусі, якой нядаўна споўнілася 85 гадоў. Між іншым, аднойчы Марыя Георгіеўна сказала: «Маё жыццё ў нечым падобна на чэхаўскую Чайку…»

Працяг на стар. 5 ►

«ЛіМ»-акцэнты

Спачуванне. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка выказаў спачуванні родным і блізкім вядомага дырыжора, дырэктара — мастацкага кіраўніка Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра народнага артыста Беларусі Міхаіла Фінберга. «Маэстра стаў сімвалам цэлай эпохі ў эстрадным мастацтве. Без астатку аддаваў сябе музыцы і гледачу. Чалавек велізарнага педагагічнага таленту выхаваў не адно пакаленне папулярных маладых выканаўцаў», — гаворыцца ў спачуванні. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што сваім шматгадовым самаадданым служэннем на ніве айчыннай культуры Міхаіл Фінберг заслужыў сапраўдную павагу калег і народную любоў. «Міхаіл Якаўлевіч — прыклад бязмежнай адданасці мастацтву і Радзіме», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Віншаванне. Беларускі лідар павіншаваў народную артыстку Расійскай Федэрацыі Клару Новікаву з днём нараджэння. «Многія гады Вы самааддана служыце мастацтву, шчодра дзеліцеся сваім талентам і эмоцыямі з паклоннікамі, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Выключны артыстызм, непаўторнае абаянне і ўнікальная працаздольнасць далі Вам магчымасць дабіцца поспеху і заваяваць любоў публікі». Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што ў Беларусі высока цэняць творчую дзейнасць артысткі.

Памяць. На пасяджэнні шостай сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі дэпутаты прынялі ў двух чытаннях законапраект «Аб генацыдзе беларускага народа», перадае БелТА. Праект закона ўнесены ў Палату прадстаўнікоў дэпутатам Ліліяй Ананіч. Упершыню на заканадаўчым узроўні дакументам прызнаецца факт генацыду беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны і ў пасляваенны перыяд. Уводзіцца крымінальная адказнасць за адмаўленне генацыду беларускага народа, якое змешчана ў публічным выступленні, у друкаваным або публічна дэманстраваным творы, у СМІ, а таксама ў інфармацыі, размешчанай у інтэрнэце. Законапраект мае палажэнні, рэалізацыя якіх будзе накіравана на ўвекавечанне памяці ахвяр генацыду, і прызначаны вывесці на больш якасны ўзровень інфармацыйную, асветную, вучэбна-выхаваўчую работу па фарміраванні маральнай і грамадска-палітычнай пазіцыі грамадзян.

Супрацоўніцтва. Міністэрства культуры ўзяло ўдзел у рэгіянальных кансультацыях ЮНЕСКА па культурнай палітыцы для Еўропы і Паўночнай Амерыкі, паведаміла БелТА. Асноўныя пытанні, якія былі разгледжаны ў анлайн-рэжыме, — інвеставанне ў культуру і творчасць. Размова датычыла стварэння працоўных месцаў, пашырэння культурнай разнастайнасці ў лічбавай прасторы, павышэння статусу творчых работнікаў. Удзельнікі абмеркавалі захаванне і папулярызацыю культурнай спадчыны ў інтарэсах сацыяльнай інтэграцыі, дыялогу і міру, умацаванне ўзаемадзеяння паміж культурай і адукацыяй для развіцця і ўстойлівасці грамадства.

Дата. 100-годдзе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, якое будзе адзначацца 15 верасня 2022 года, занесена ў спіс памятных дат ЮНЕСКА, паведамілі ў НББ. Рашэнне прынята на 41-й сесіі Генеральнай канферэнцыі арганізацыі. Уваходжанне ў каляндар ЮНЕСКА пацвярджае важкі ўклад бібліятэкі ў развіццё сусветнай культуры, спрыяе інтэграцыі галоўнай кніжніцы Беларусі ў сусветную бібліятэчную супольнасць і дазволіць узбагаціць дзейнасць бібліятэкі па захаванні і выкарыстанні нацыянальнага культурнага здабытку. Усяго ў каляндар мерапрыемстваў на 2022—2023 гады ўвайшлі 67 найбольш важных падзей са ўсяго свету.

Праект. Арыгінальны экзэмпляр Радзівілаўскай Бібліі — самага прыгожага і маштабнага беларускага выдання XVI—XIX стагоддзяў, якое атрымала прызнанне як шэдэўр эпохі Адраджэння — прадстаўлены ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, дзе адкрылася выстаўка «Той самы падарунак да 1000-годдзя». У шырокай грамадскасці Мінска ўпершыню ёсць магчымасць убачыць арыгінал знакавага кніжнага помніка — Брэсцкай Бібліі, якая была падорана на тысячагоддзе горада ў 2019 годзе Прэзідэнтам Беларусі. Пасля 21 снежня Біблія вернецца ў Брэст, дзе ўжо стала сапраўдным брэндам. Разам са спецыяльна дастаўленым унікальным экзэмплярам на выстаўцы экспануецца і факсімільнае выданне Брэсцкай Бібліі, выпушчанае да святкавання тысячагоддзя горада над Бугам, паведаміла БелТА.

Рэгіёны. Выстаўку «Галаграфія-2021. Гомель» прапануюць у карціннай галерэі Г. Х. Вашчанкі. У цэнтры экспазіцыі — калекцыя мастацкіх галаграм дакладных аптычных вобразаў мастацкіх і культурных каштоўнасцей, арыгіналы якіх недаступны шырокаму колу. Паводле арганізатараў, прадстаўленае ў экспазіцыі створана дзякуючы навуковым распрацоўкам і пад непасрэдным кіраўніцтвам беларускага вучонага-фізіка Леаніда Таніна на ТАА «Магія святла». У супрацоўніцтве з Беларускай праваслаўнай царквой і шэрагам музеяў краіны зроблены галаграфічныя выявы праваслаўных святынь, сярод якіх — «Дары вешчуноў», «Крыж Ефрасінні Полацкай», «Жыровіцкі абраз Божай Маці», «Тураўскі крыж», а таксама аптычныя копіі каштоўных экспанатаў музеяў «Пояс Вітаўта», «Слуцкі пояс», калекцыі ордэнаў і медалёў, некаторых іншых цікавых экспанатаў.

Агляд афіцыйных падзей ад Інесы ПЕТРУСЕВІЧ

стасункі

Прыклад міралюбства і добрасуседства

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Прэзідэнта Туркменістана Гурбангулы Бердымухамедава з нацыянальным святам — Міжнародным днём нейтралітэту. «Кіруючыся дадзеным прынцыпам, Туркменістан робіць важкі ўнёсак у забеспячэнне міжнароднай стабільнасці і бяспекі, з'яўляецца прыкладам міралюбства і добрасуседства», — гаворыцца ў тэксце віншавання да свята 12 снежня.

Гістарычныя адносіны, якія склаліся паміж Мінскам і Ашхабадам, здолеюць стаць падмуркам, упэўнены Аляксандр Лукашэнка, «для развіцця канструктыўнага палітычнага дыялогу, актывізацыі эканамічных і гуманітарных кантактаў».

Днямі ў Выдавецкі дом «Звязда» прыйшоў ліст з часопіса «Дунья эдэбіяты» («Сусветная літаратура») ад туркменскага пісьменніка і перакладчыка Максата Бяшымава, які паведаміў, што ў найбліжэйшым нумары іх аўтарытэтнага літаратурна-мастацкага часопіса выходзяць пераклады вершаў вядомага айчыннага паэта Віктара Шніпа ў перакладзе на туркменскую.

Трэба заўважыць, што ў нашых літаратараў наладжана добрае супрацоўніцтва са згаданым выданнем. Шмат чые творы з паэтаў і празаікаў Беларусі ў апошняе дзесяцігоддзе, пачынаючы з 2012 года, былі надрукаваны ў «Дунья эдэбіяты». Развіццю беларуска-туркменскіх сувязей апошнім часам таксама спрыяў і літаратурны часопіс «Гарагум», а дакладней — пісьменніца, якая ў ім працавала, Бягуль Анабаева.

У 2015—2019 гг. у Беларусь наведаліся літаратары — Герой Туркменістана Гузель Шагулыева, паэт Агагельды Аланазараў (у Мінску на беларускай мове выдадзены тры яго кнігі), празаік Бягуль Анабаева, паэтэса Чэмен Анабердыева. У Туркменістане ўжо ў постасавецкі час пабывалі беларускія літаратары Алесь Бадак, Алена Масла, Генадзь Пашкоў, Ігар Лапцёнак, Юлія Алейчанка… Будзем спадзявацца на працяг, шырокае развіццё беларуска-туркменскіх гуманітарных і літаратурных сувязей.

Сяргей ШЫЧКО

вектар

Беларусь — Іран: шляхі літаратурнага супрацоўніцтва

У Пасольстве Ірана ў Беларусі абмеркаваны тэмы культурнага і кнігавыдавецкага супрацоўніцтва. Адбылася сустрэча кіраўніка дыпламатычнай місіі з дырэктарам — галоўным рэдактарам Выдавецкага дома «Звязда», галоўным рэдактарам урадавай і парламенцкай газеты «Звязда» Аляксандрам Карлюкевічам.

— Лічу, што стасункі паміж краінамі-сяброўкамі ў значнай ступені фарміруюцца за кошт зносін у гуманітарнай сферы. Маё знаёмства з Беларуссю паказала, якая багатая ў вашай краіне нацыянальная культура, — зазначыў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Ісламскай Рэспублікі Іран у Рэспубліцы Беларусь Саід Яры. — Я ўжо пабываў у такіх гістарычных цэнтрах, як Нясвіж і Мір. Музейныя комплексы ў гэтых мясцінах мяне надзвычай уразілі. Збіраюся наведацца ў Брэсцкую крэпасць. Хацелася б пазнаёміць беларусаў і з нашай іранскай культурай. Лічу, што найлепей зрабіць гэта праз мастацкую літаратуру.

Размова на сустрэчы ў пасольстве ішла і пра выданне кнігі класіка ўсходняй паэзіі Амара Хаяма ў перакладзе на беларускую мову. Аляксандр Карлюкевіч расказаў пра першыя крокі ў гэтым напрамку. Вершы класіка ўжо часткова пераўвасоблены на мову Купалы. Раней гэтай перакладчыцкай працай займаўся народны паэт Беларусі Рыгор Барадулін. Цяпер да беларускага прачытання спадчыны Амара Хаяма падключыўся лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі Беларусі паэт Віктар Шніп. Кніга павінна пабачыць свет у пярэдадзень чарговай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу ў Мінску.

Спадар Саід Яры прапанаваў для рэалізацыі яшчэ адну ідэю, выказаўшы прапанову далучыць да гэтага клопату і беларускае пасольства ў Іране: выдаць кнігу вершаў беларускіх класікаў — Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча ў перакладзе на фарсі. Размова ішла пра тое, што добра было б рэалізаваць гэты праект да 30-годдзя ўсталявання дыпламатычных адносін Беларусі і Ірана, якое краіны будуць адзначаць у 2023 годзе. Такая кніга, выдадзеная ці ў Тэгеране, ці нават у Мінску, стане, безумоўна, яркім актам літаратурнага, культурнага сяброўства.

Мікола БЕРЛЕЖ

прэміі

Творчы агеньчык жыве

Падчас літаратурнага свята ў Лунінскай СШ названы лаўрэаты прэміі Брэсцкага аблвыканкама імя Уладзіміра Калесніка. Дзясятае па ліку ўручэнне ганаровай узнагароды вярнулася пасля доўгага перапынку на Лунінеччыну, а ўпершыню яно адбылося яшчэ ў 2007-м.

Літаратурнае свята са сваімі паплечнікамі-аднадумцамі заснаваў вядомы пісьменнік і журналіст Мікалай Елянеўскі, ураджэнец Луніна. На жаль, ён рана пайшоў з жыцця, але запалены творчы агеньчык падтрымліваецца.

З першых хвілін госці трапілі ў атмасферу душэўнай цеплыні і шчырай гасціннасці гаспадароў лунінецкай зямлі. Удзельнікаў свята сустракалі духмянымі караваямі. Мясцовыя настаўніцы ў нацыянальных строях выканалі народны танец, а маленькая гаспадыня Ульяна Сацкевіч у вобразе Лунінскай восені разам з юнымі памочнікамі правяла цікавую экскурсію па школе.

Супрацоўнікі Брэсцкай абласной бібліятэкі імя М. Горкага падрыхтавалі кніжную выстаўку кніг лаўрэатаў прэміі У. Калесніка.

На афіцыйнай цырымоніі, якая праходзіла ў школьнай актавай зале, прысутных вітаў старшыня Лунінецкага райвыканкама Аляксандр Пачко. Намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Генадзь Барысюк расказаў пра сяброўства свайго бацькі з Уладзімірам Калеснікам, падкрэсліўшы, як важна захоўваць традыцыі знакамітых пісьменнікаў, культурную спадчыну.

Ва ўрачыстай абстаноўцы названы імёны лаўрэатаў літаратурнай прэміі 2021 года. У намінацыі «Паэзія» перамогу падзялілі Любоў Красеўская (за кнігу «Тая самая сіла») і Мікола Антаноўскі (за зборнік паэзіі «Як ліст сярод лістоў»). У намінацыі «Проза» — аўтар серыі кніг «Лунінецкая памяць» Таццяна Канапацкая, у намінацыі «Дзіцячая літаратура» — аўтар фэнтэзійнай аповесці «Марго і чароўны экран» Ірына Морых і стваральніца кнігі казак «Размалёваны свет» Наталля Кухліч. Па выніках конкурсу граматай і грашовай прэміяй Брэсцкай абласной арганізацыі Беларускага саюза журналістаў узнагароджаны Мікола Панасюк за дакументальную аповесць «Пётр Клімук. Жыццё і подзвіг касманаўта».

Генадзь Барысюк з лаўрэатамі абласной літаратурнай прэміі імя У. Калесніка.

Таццяна ДЗЕМІДОВІЧ
Фота даслана аўтарам

фестывалі

Акцэнт — на сямейную праграму

Напярэдадні Каляд у Мінску стартуе міжнародны праваслаўны фестываль «Радасць». Свята пройдзе ў Палацы мастацтваў з 22 снежня да 6 студзеня пры падтрымцы Мінгарвыканкама і па благаславенні мітрапаліта Мінскага і Заслаўскага Веніяміна, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі.

«Радасць» — фестываль, які дае магчымасць бліжэй пазнаёміцца з праваслаўем, адкрыць для сябе харастве веры, даведацца шмат новага і карысна правесці час. У фэсце возьмуць удзел святары, урачы, псіхолагі, мастакі, якія падзеляцца досведам, парадамі, адкажуць на пытанні.

Арганізатары маюць на мэце захаванне і развіццё хрысціянскіх традыцый, умацаванне маральнасці, патрыятычнае і духоўнае выхаванне дзяцей і моладзі, пашырэнне ведаў пра гістарычную спадчыну праваслаўя. Сёлета «Радасць» абвясцілі як сямейны фестываль — акцэнт зроблены на сямейную праграму, якая будзе цікава ўсім.

Гасцей чакаюць творчыя сюрпрызы, прэзентацыі, экскурсіі ў часе. Кожнаму будзе дадзена магчымасць праявіць сябе, зрабіць падарункі ўласнымі рукамі, змайстраваць цацкі для святочнай ёлкі, паглядзець лялечныя і батлеечныя спектаклі. Наведвальнікі свята таксама змогуць пабываць на інтэрактыўнай пляцоўцы «Гісторыя Каляд» і даведацца, як святкуюць Раство ў розных краінах свету. Будуць працаваць мастацкая выстаўка, кіназона, кабінет здароўя. Для самых маленькіх арганізуюць дзіцячыя ранішнікі з Дзедам Марозам.

Гасцей фестывалю чакае вялікая Калядная выстаўка-кірмаш, дзе свае вырабы прэзентуюць манастыры, храмы, рамеснікі з розных краін. Унікальныя абразы, святочныя сувеніры, рэдкія кнігі, кераміка, прадукцыя для здароўя і прыгажосці, тэкстыль і швейныя вырабы стануць запамінальнымі падарункамі да Каляд. На кірмашы таксама можна пакаштаваць стравы ў манастырскай трапезнай. Наведвальнікі фестывалю змогуць узяць удзел у дабрачыннай акцыі, каб падзяліцца часцінкай дабра.

Дзіяна КАЗІМІРЧЫК

памяць

Праз прызму чалавечых лёсаў

Часовая экспазіцыя «Бітва за Маскву. Неўміручасць подзвігу», прысвечаная 80-годдзю Маскоўскай бітвы, працуе ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Упершыню тэма «Бітвы за Маскву» так грунтоўна прадстаўлена ў межах супрацоўніцтва Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Дзяржаўнага музея абароны Масквы і Музея Перамогі.

Галоўная мэта выстаўкі — праз прызму чалавечых лёсаў паказаць трагедыю і подзвіг абаронцаў Радзімы, ролю бітвы ў гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, актуальнасць яе падзей для цяперашняга і будучых пакаленняў.

Дзяржаўны музей абароны Масквы прадставіў унікальныя сведчанні подзвігу абаронцаў сталіцы: здымкі ваенных фотакарэспандэнтаў Аляксандра Усцінава, Уладзіміра Мінкевіча, Міхаіла Савіна, плакаты перыяду пачатку бітвы за Маскву і дакументальныя матэрыялы.

Экспанаты з фондаў Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны арганічна ўпісаны ў аповед пра абарону і контрнаступленне пад Масквой. Гэта матэрыялы, якія расказваюць пра лёсы байцоў і камандзіраў Чырвонай Арміі, ураджэнцаў Беларусі і Расіі, якіх звязала вайна. Так, 17-гадовым студэнтам разам з бацькам уступіў у народнае апалчэнне Пётр Бухтаяраў, які прайшоў усю вайну і ўдзельнічаў у вызваленні Беларусі.

У народным апалчэнні пачынаўся і баявы шлях заслужанага мастака РСФСР Мікалая Обрыньбы: ён трапіў пад Вязьмай у палон, змог уцячы і далучыўся да беларускіх партызанаў брыгады Дубава, што дзейнічала на Віцебшчыне.

Ветэран вайны Валянціна Баранава падчас адкрыцця выстаўкі.

Начальнікам артылерыі Заходняга фронту падчас Маскоўскай бітвы быў беларус генерал-лейтэнант артылерыі Іван Камера. Медаль «За абарону Масквы» атрымаў ураджэнец Магілёўскай вобласці Герой Савецкага Саюза Аляксандр Рабцэвіч — камандзір батальёна асобнай мотастралковай брыгады асаблівага прызначэння НКУС СССР.

Фотадакументальныя матэрыялы Музея Перамогі ў цэнтральнай частцы экспазіцыі раскажуць пра падрыхтоўку і правядзенне ўнікальнага парада 7 лістапада 1941 г. на Краснай плошчы ў Маскве.

Міра ІЎКОВІЧ

Фота даслана Беларускім дзяржаўным музеем гісторыі Вялікай Айчыннай вайны

форум

Зоркі ў Оперным

Гэтымі днямі ў Вялікім тэатры оперы і балета Беларусі праходзіць XI Мінскі міжнародны Калядны форум. Сёлета ў праграме — прэм'еры спектакляў бягучага сезона, вядомыя госці з Расіі, Азербайджана, Грузіі, Італіі. Старт маштабнаму фестывалю даў паказ прэм'еры оперы «Самсон і Далілa», рэжысёрам-пастаноўшчыкам якой выступіла заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь Аксана Волкава.

У Вялікім тэатры Беларусі «Самсона і Далілу» яшчэ ні разу не ставілі. Сярод галоўных цяжкасцей называлі праблему з тэнарамі, якія змаглі б выканаць ролю Самсона. Цяпер тэнараў тры. Партыю Далілы, апроч Аксаны Волкавай, выконваюць яшчэ тры салісткі.

— З аднаго боку, чатыры склады — вельмі шмат, гэта вялізная праца для пастаноўчай групы. З іншага — хочацца максімальна задзейнічаць нашых салістаў, я бачу, як у іх гараць вочы, з'явілася канкурэнцыя ў добрым сэнсе слова. У многім, вядома, справа ў спектаклі. Гэта музыка надзвычайнай прыгажосці, яна вартая таго, каб быць на сцэне нашага тэатра, — падкрэсліла Аксана Волкава падчас прэс-канферэнцыі, прысвечанай форуму. Дарэчы, артыстка ўжо выходзіла ў вобразе Далілы ў Нацыянальным цэнтры выканальніцкіх мастацтваў у Пекіне. У 2014—2015 гадах у Кітаі прайшлі спектаклі з яе ўдзелам.

У склад пастановачнай групы ўвайшоў таксама дырыжор Алег Лясун. Мастаком-пастаноўшчыкам выступіла лаўрэат расійскай нацыянальнай тэатральнай прэміі «Залатая маска» Этэль Іошпа. За святло і відэакантэнт адказваў лаўрэат расійскай нацыянальнай тэатральнай прэміі «Залатая маска» Станіслаў Свістуновіч. Хормайстар-пастаноўшчык — народная артыстка Беларусі Ніна Ламановіч, балетмайстар-пастаноўшчык — лаўрэат міжнародных конкурсаў Сяргей Мікель.

Акрамя спектакляў, у праграме форуму заяўлены два вялікія канцэрты. Завяршальным стане 22 снежня гала-канцэрт зорак сусветнай оперы.

Яўгенія ШЫЦЬКА

Дыялог-канцэрт

Сёння ў межах Каляднага опернага форуму ў Вялікім тэатры оперы і балета Рэспублікі Беларусь пройдзе сольны канцэрт Кацярыны Семянчук — адной з самых запатрабаваных спявачак свету.

Прыма Марыінскага тэатра беларуска Кацярына Семянчук прадставіць сваіх любімых драматычных гераінь — Далілу з «Самсона і Далілы», Прынцэсу дэ Буён з «Адрыяны Лекуврэр», Сантуцы з «Сельскага гонару», Эболі з «Дона Карласа».

У гэты вечар за пультам — галоўны дырыжор Азербайджанскага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра оперы і балета Эйюб Куліеў, які на сцэне сустрэнецца з Семянчук упершыню.

— Спадзяюся, праграма здзівіць беларускую публіку, якую, наколькі ведаю, уразіць складана, — зазначыў маэстра Куліеў. — У Семянчук — велізарны рэпертуар. І кожны раз Кацярына даказвае: яна адна з найлепшых спявачак свету. Выдатна, што наш першы творчы дыялог адбудзецца менавіта ў Мінску, у горадзе, які зблізка. Вельмі спадзяюся, што Кацярына Семянчук прыедзе і да нас у Баку.

Вера СТРОК

«ЛіМ»-люстэрка

Фільм «Красналюдкі» вытворчасці Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» прызнаны найлепшым анімацыйным фільмам на Міжнародным кінафестывалі ў Чыкага, інфармуе БелТА. Стужка ўваходзіць у цыкл «У Палессі на балоце», які складаецца з чатырох кароткаметражных фільмаў: «Цмок» (рэжысёр Руслан Сінкевіч), «Крыжацік» (рэжысёр Святлана Катлярова), «Малімон» (рэжысёр Маргарыта Герашчанка) і «Красналюдкі». Сюжэт мультфільма расказвае гісторыю аб маленькіх і добрых стварэннях красналюдках, якія выручаюць па начах тых, хто стварае што-небудзь добрае. Аднойчы, калі яны прыйшлі, каб дапамагчы хлопчыку, які зрабіў птушку, на іх накінуўся кот. Невядома, чым бы ўсё скончылася, калі б не прачнуўся малы. Аўтар сцэнарыя, рэжысёр і мастак-пастаноўшчык «Красналюдак» Раман Бурмакоў.

Падведзены вынікі XVIII Міжнароднага дзіцячага конкурсу «Музыка надзеі», заключны этап якога праходзіў з 6 да 10 снежня на базе Гомельскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў імя Н. Ф. Сакалоўскага. Уладальнікам Гран-пры (намінацыя «Драўляныя духавыя інструменты») стала Сафія Крат з Рэспубліканскай гімназіі-каледжа пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. Дыпломамі I ступені ў малодшай узроставай групе ўзнагароджаны Кірыл Бурдзін (Магілёўская дзяржаўная гімназія-каледж мастацтваў імя Яўгена Глебава), Сафія Вашкевіч (Рэспубліканская гімназія-каледж), Сяргей Сухоцкі (Воранаўская дзіцячая школа мастацтваў). У старэйшай узроставай групе — Фёдар Громаў і Марыя Дзеева з Рэспубліканскай гімназіі-каледжа. У намінацыі «Медныя духавыя і ўдарныя інструменты» дыпломамі I ступені ў малодшай узроставай групе ўзнагароджаны Дамір Бандарэнка з дзіцячай музычнай школы мастацтваў № 1 імя П. І. Чайкоўскага ў Гомелі, Аляксандр Чыкоўскі з Бераставіцкай дзіцячай школы мастацтваў, Георгій Макаранка са Слуцкай дзіцячай школы мастацтваў, Святаслаў Батальёнак з Рэспубліканскай гімназіі-каледжа. Лаўрэатамі I ступені ў старэйшай узроставай групе сталі Іван Глаз (Рэспубліканская гімназія-каледж), Алесь Фаміч (Старабарысаўская дзіцячая школа мастацтваў).

Сёння апошні дзень работы інтэрактыўнай выстаўкі «Чатыры галоўныя вынаходствы Кітая», якую праводзіць Інстытут Канфуцыя па навуцы і тэхніцы БНТУ ў Мінскім гарадскім палацы дзяцей і моладзі. «У зале можна паглядзець фатаграфіі, відэа і 3D-выявы, убачыць розныя мініяцюры. Сярод іх — кітайскія маскарадныя маскі, распісаныя ў народных матывах вазы і талеркі, розныя віды компасаў, порах. Ёсць і прадметы, якія задзейнічалі ў кнігадрукаванні. Таксама прадстаўлены маленькія копіі кітайскіх спадарожнікаў, хуткасных паяздоў і самалётаў, іншых тэхнічных дасягненняў», — цытуе БелТА словы спецыяліста першай катэгорыі ІКНТ Настассі Малухінай. Выстаўка праводзіцца пры падтрымцы БНТУ, Паўночна-Усходняга ўніверсітэта кітайскага горада Шэньян, Цэнтра моўнай адукацыі і супрацоўніцтва Міністэрства адукацыі КНР і Пасольства Кітая ў Беларусі.

На пятнаццатых маладзёжных Дэльфійскіх гульнях дзяржаў — удзельніц СНД у намінацыі «Скрыпка» першае месца прысуджана беларусцы Яне Вайцяховіч. Яна выканала «Танец смерці» Міхаіла Ельскага. У намінацыі «Духавыя інструменты» перамог беларус Фёдар Громаў. Як паведамляе БелТА, спаборніцтвы былі арганізаваны па 10 катэгорыях. У гульнях прынялі ўдзел амаль 700 дзеячаў мастацтваў высокага ўзроўню майстэрства ва ўзросце ад 10 да 25 гадоў. Арганізацыяй і правядзеннем маладзёжных Дэльфійскіх гульняў займаўся Нацыянальны Дэльфійскі савет Расіі пры падтрымцы Выканаўчага камітэта СНД, МПА СНД, Савета па культурным супрацоўніцтве дзяржаў Садружнасці, Савета па справах моладзі СНД.

Цырымонія адкрыцця помніка пісьменніку Фёдару Дастаеўскаму адбылася ў Фларэнцыі, адміністрацыйным цэнтры вобласці Таскана. Выбар месца размяшчэння помніка невыпадковы: у Фларэнцыі пісьменнік пражываў у жніўні 1862 года і са снежня 1868 года да жніўня 1869-га. Рускі класік быў зачараваны Італіяй і асабліва сталіцай Тасканы. Менавіта тут Дастаеўскі завяршыў раман «Ідыёт». Аўтар бронзавага помніка — скульптар, акадэмік Расійскай акадэміі мастацтваў Айдын Зейналаў. Вышыня манумента разам з пастаментам складае больш за 3 метры. Пісьменнік стаіць, скрыжаваўшы рукі на грудзях, трымае раман «Ідыёт», а каля ног ляжаць разбітыя кайданы.

Цікавінкі ад Яўгеніі ШЫЦЬКІ

Мікалай ЧАРГІНЕЦ:

«Літаратары адчуваюць сваю адказнасць»

У студзені ў Саюзе пісьменнікаў Беларусі адбудзецца з'езд. Шэраг пытанняў для абмеркавання ў шырокай аўдыторыі аднадумцаў і калег па пяры тычыцца жыцця ўсёй краіны, іншыя — прафесійныя. Некаторыя — асабовыя. Разважаннямі, планамі і надзеямі напярэдадні мерапрыемства з карэспандэнтам «ЛіМа» падзяліўся старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай Чаргінец.



Мікалай Чаргінец.

Пра вынікі

Рыхтуючыся да з'езда, падводзім вынікі сваёй працы за пяць гадоў. Мне як кіраўніку арганізацыі вельмі імпануе тое, што шэраг нашых пісьменнікаў высока ацэнены дзяржавай, узнагароджаны ордэнамі, медалямі. Многія літаратары атрымалі званне заслужаных дзеячаў культуры. А колькі адзначана прэміямі на нашых конкурсах!..

Саюз пісьменнікаў Беларусі за гэты час вырас і па якасці, і па колькасці! І, што вельмі істотна, за кошт прытоку маладых: іх было прынята больш за сотню. Так, нярэдкая з'ява, што моладзь ужо ў 14—15 гадоў піша добрыя творы, у якіх відаць іх душа! І хай гэта пераважна вершы, празаікамі яны стануць пазней, галоўнае, што ёсць талент і ён нікуды не знікне!

Радуе мяне і тое, што мы, займаючыся сваёй справай, здолелі супакоіць тых, хто рваўся на «барыкады». Так, мы зрабілі шэраг заяў, заклікаючы людзей да спакою, звярнуліся да калег за мяжой, зыходзячы з таго, што асабліва цяпер патрэбна клапаціцца, каб літаратура яднала людзей, а не раз'ядноўвала. А гэта значыць, што трэба сустракацца, размаўляць, абмяркоўваць, абменьвацца творчымі энергіямі, разам рэалізоўваць праекты.

Праз адлюстраванне мінулага — да сучаснасці

У нас з'явілася нямала добрых кніг. Асабліва дзіцячых — прыгожых, з добрым тэкстам і, што важна найперш, з сучасным… Бо ёсць пісьменнікі, якія жывуць быццам у мінулым, не разумеючы, што сённяшнія дзеці з малых гадоў валодаюць камп'ютарам, а гэта трэба ўлічваць! Але некаторыя літаратары ўсё ж здолелі знайсці тыя нябачныя струны ў душах юных чытачоў, якія трэба ўмела і ненавязліва закрануць чулай «рукой».

Выхаванне словам

Хачу заўважыць, што пісьменнікі адчуваюць сваю адказнасць за падзеі ў краіне і ўвогуле ў свеце. І, што вельмі істотна, многія з іх дабіваюцца таго, каб яе адчулі і чытачы. Бо часам маладыя людзі забываюць аб уласнай адказнасці за многія рэчы — не паважаюць бацькоў, законы і ўрэшце трапляюць у сітуацыю, якая прыводзіць іх да маральнага краху… Таму вельмі істотна, каб творца, працуючы над тым ці іншым сюжэтам, памятаў: у чытача трэба выхоўваць любоў да маці, да сям'і, а праз гэта — і да дзяржавы, і да грамадства, каб ён адчуў сваю долю адказнасці перад людзьмі: блізкімі, тымі, хто побач, хто жыве з табою ў адных межах. Мы пастаянна разважаем пра гэта і пераконваем пісьменнікаў, што згаданая тэматыка ў творах абавязкова павінна быць!

На каго азірацца і да чаго імкнуцца

За апошнія гады мы правялі даследчыцкую працу і высветлілі, што існуе больш чым дзве тысячы прозвішчаў людзей, ураджэнцаў Беларусі, якія праславілі сваю радзіму за яе межамі. Але пра многіх з іх амаль ніхто не ведае!.. Так, ёсць Мора Лапцевых, а Лапцевы — гэта ж беларусы! Грыгорый Пацёмкін, Мікалай Пржавальскі маюць дачыненне да Беларусі, як і лейтэнант Яўген Бурачок, помнік якому стаіць ва Уладзівастоку. А пра гэта таксама мала хто ведае!

Над чым больш працаваць

Калі разважаць пра тое, дзе ў нас прабелы, можна прыгадаць, што асабліва бракуе кніг па тэме Першай сусветнай вайны. І гэта ў той час, як у беларускай зямлі ляжыць да мільёна загінулых салдат і афіцэраў самых розных нацыянальнасцей, якія нават не былі па-хрысціянску пахаваны!.. Пісьменнік Вячаслаў Бандарэнка прысвяціў свае творы такой тэматыцы — дык яго кнігі ў серыі ЖЗЛ перавыдалі нават у Расіі! Ён узняў пласт, што да яго быў нечапаны. Хачу як чытач адзначыць, што Вячаслаў Бандарэнка вельмі ўдала паказаў гэтую тэму, нягледзячы на тое, што ў яго былі ваганні: як пісаць, напрыклад, пра генерала, які праявіў гераізм, а пасля рэвалюцыі стаў па іншы бок? Параіў яму: «Як было, так і пішы…»

Калі вярнуцца да тэматыкі дзіцячай літаратуры, то сярод тысячы прозвішчаў, пра якія гаворка ішла вышэй, мы намацалі сцяжынку, як паказаць гэтых людзей. Наш пісьменнік Валерый Чудаў выдаў некалькі дзясяткаў маленькіх кніг — пра жыццё канкрэтных асоб. Вялікі шрыфт, выдатнае афармленне — дзеці чытаюць з задавальненнем!

Кола праблем

Ёсць у нас і праблемы, якія абавязкова будуць агучаны на з'ездзе. Так, на маю думку, недапушчальна, што пісьменнікі атрымліваюць мізэрную пенсію.

На Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўцы-кірмашы, 2021 г.

Уладзіслаў Старэвіч, стваральнік мультфільмаў, які атрымліваў перамогу на ўсіх мастацкіх конкурсах — да 1970 года ўсе ўзнагароды былі яго, — ураджэнец Беларусі, з беднай шляхецкай сям'і. У Парыжы ў 1968 годзе на чарговым конкурсе, дзе ён узяў найвышэйшую ўзнагароду, журналісты спыталі: «Як вы навучылі вашых жучкоў апранацца і надзяваць капялюш?» Яны нават не зразумелі, што мульцікі былі намаляваныя! Чаму б на нашым «Беларусьфільме» не ўсталяваць памятную дошку ў яго гонар? Не напісаць пра яго жыццё біяграфічную аповесць?..

А калі згадаць, як Суворaў і Кутузаў бралі Ісмаіл? Гэта атрымалася толькі дзякуючы Полацкаму палку, на сто працэнтаў камплектаванаму з беларусаў! Вось задача для пісьменнікаў: трэба распавесці пра подзвігі слынных суайчыннікаў!

Значыць, трэба распрацаваць законапраект, які дазволіў бы, каб творцы, якія хаця б маюць узнагароды і званні, а таксама тыя, чые творы вывучаюць у школах, атрымлівалі трохі больш у матэрыяльным плане.

Пісьменнік — чалавек, які ўкладвае душу ў інтарэсы дзяржавы, і, магчыма, часам для яго трэба зрабіць выключэнне з агульнапрынятых правіл.

Асабліва востра стаіць і праблема з выданнем кніг: чаму пісьменнік павінен гэта рабіць за ўласныя грошы, калі ў большасці выпадкаў і без таго жыве не ў раскошы?..

Творцы, самыя розныя

На маю думку, нельга сказаць, што адны пісьменнікі, напрыклад, лаўрэаты высокіх прэмій, больш значныя, чым іншыя, якіх ведаюць толькі ў сваёй ваколіцы. Ва ўсім разбярэцца час, а мы падтрымліваем усіх нашых творцаў — кожны з іх варты таго, каб яго чыталі і разважалі аб прачытаным. Тыя, хто піша пра сваю родную вёску,

…існуе больш чым дзве тысячы прозвішчаў людзей, ураджэнцаў Беларусі, якія праславілі сваю радзіму за яе межамі. Але пра многія з іх амаль ніхто не ведае!.. Так, ёсць Мора Лапцевых, а Лапцевы — гэта ж беларусы! Грыгорый Пацёмкін, Мікалай Пржавальскі маюць дачыненне да Беларусі, як і лейтэнант Яўген Бурачок, помнік якому стаіць ва Уладзівастоку. А пра гэта таксама мала хто ведае!

пакідаюць людзям памяць, зарад добрага і светлага. Бо калі даведваешся нешта новае, добрае пра родныя мясціны, аднавяскоўцаў, суседзяў, гэта стварае бадзёры, аптымістычны настрой, і ты, у сваю чаргу, гатовы здзейсніць шмат спраў, камусьці дапамагчы. Хай узровень творчасці такіх літаратараў — мясцовага значэння, але гэта не адмаўляе іх станоўчай ролі для развіцця сучаснага літаратурнага працэсу.

У сучасных умовах

Янка Купала калісьці сказаў, што пісьменнік — гэта вочы і вушы народа. І раней да пісьменніка ставіліся зусім паіншаму, чым цяпер, магчыма, таму, што не было інтэрнэту… Потым папяровая кніга пачала страчваць свае пазіцыі… Але ў апошнія гады мы пабачылі, што цікавасць да кнігі як да прадмета чытання няўхільна ўзрастае. Так, кожныя тры гады праводзім даследаванні: складаем спісы найбольш запатрабаваных у бібліятэках пісьменнікаў. І выявілася, што гэта 91 чалавек. Насупраць кожнага з літаратараў бібліятэкары давалі адказ: ці мае ўстанова яго кнігі і колькі разоў за апошнія гады іх запытвалі. Дык кнігі гэтых літаратараў бралі каля трох мільёнаў разоў! Гэта дазволіла вывесці своеасаблівы рэйтынг, высветліць: попыт пераважае над колькасцю кніг, што маюцца ў бібліятэцы, альбо наадварот…

Вынікі даследавання сведчаць і пра тое, што цікавасць да кнігі пачала расці. Не ў апошнюю чаргу дзякуючы і таму, што з'явіліся пісьменнікі, якія пішуць і на сучасныя, і на гістарычныя тэмы, — яны найбольш прыцягваюць увагу чытачоў.

Крэда пісьменніка

Пісьменнік павінен думаць аб дзяржаве, а дзяржава — аб ім. Акрамя таго, кожны пісьменнік абавязкова павінен быць самакрытычным і цвяроза ацэньваць уласныя творы. Адсутнасць у нас інстытута крытыкі — істотная праблема. Тое, што можна пачытаць, асабліва ў сеціве, але часам і на старонках выданняў, — артыкулы альбо кампліментарныя, альбо абразлівыя… А трэба, каб крытыка не забівала пісьменніка, не зневажала яго як асобу, а далікатна ўказвала на недахопы і шляхі іх выпраўлення. Пісьменнік жа, у сваю чаргу, тады пісаў бы наступны твор ужо з улікам гэтых крытычных заўваг.

Аліса БРАТКА

Фота Кастуся Дробава

Нарачанская Чайка

Як вядома, пасля тэатральна-мастацкага інстытута Марыя Захарэвіч прыйшла працаваць у Купалаўскі тэатр. І ён стаў яе адзінай любоўю на ўсё жыццё. Вось што сказаў пра сваю зямлячку народны мастак Беларусі Васіль Пятровіч Шаранговіч:

— У яе ёсць усё: унутраная абаяльнасць і знешняя прыгажосць, прыродная чуласць і далікатнасць, прага хараства і гармоніі, памножаныя на талент. Але горад не вытравіў з яе, як і з мяне, вёску. Самыя лепшыя вобразы ў Захарэвіч — беларускія жанчыны. Яна і сама вобраз! Ёй верыш на сцэне! Голас грудны, натуральны, мова чыстая, глыбінная…

Ну, вылітая чэхаўская Чайка.

Першыя крокі да жаданага вобраза Марыя Георгіеўна зрабіла яшчэ ў інстытуце. Цягнула яе да драматычных роляў, у тыя сцэны, дзе душа кіпіць цераз край. На трэцім курсе быў экзамен па маналогу. Яго трэба было здаць педагогу па сцэнічнай мове Паўлу Сцяпанавічу Малчанаву. Адно яго імя выклікала ў студэнтаў дрыжыкі. І не таму, што ён быў строгі. Проста сорамна перад такім аўтарытэтам выглядаць дылетантам. А Марыя Захарэвіч да таго ж выбрала няпросты маналог Ніны Зарэчнай з любімай п'есы. Яна адчувала радство з гераіняй. Ніна жыла каля возера з чайкамі, і яе Навасёлкі — недалёка ад Нарачы. Абедзве хацелі стаць артысткамі.

А трэба яшчэ ўлічыць, што маналог для любога артыста — вельмі складаны сцэнічны жанр, дамінанта ролі. Артыст часцей за ўсё адзін на адзін з гледачом. На яго скіраваны тэатральныя ліхтары. Яны высвечваюць твар, рукі. Прыкмячаюцца ўсе дробязі: рух вуснаў, мірганне веек, бляск вачэй, дыханне, жэсты. О, гледачы ўсё бачаць! У момант маналогу на ім трымаецца спектакль, праяўляецца сіла акцёра, талент уплываць на публіку.

Марыя Захарэвіч назубок вывучыла складаную чэхаўскую п'есу, адчула атмасферу спектакля і з высокім пачуццём выканала маналог Ніны Зарэчнай. Яе цягнула да сцэнічнай драмы.

На рахунку маладой актрысы ў Купалаўскім было ўжо нямала сцэнічных вобразаў у п'есах «Пакуль маладыя» Івана Мележа, «Святая святых» Іона Друцэ, «Вечар» Аляксея Дударава, «Сэрца на далоні» Івана Шамякіна, «Людзі на балоце» Івана Мележа. Аднак жыццё рыхтавала сваю драму.

Мелася адбыцца прэм'ера. Два саставы артыстаў гатовы былі выйсці на сцэну. Рыхтавалі афішы, праграмы, буклеты. У гэты час Марыя Захарэвіч атрымала тэлеграму з дому: «Прыедзь. Бацьку дрэнна…» Трэба ляцець! Стаяла снежная зіма. Віхурны баль гуляла злосная мяцеліца. Марыя выйшла з аўтобуса. Да бальніцы рукой падаць, але ж моцная завіруха, гурбы снегу. Ішла прама па дарозе, утуліўшыся тварам у каўнер чорнага футра. І раптам белай зданню на яе наляцеў аўтобус. У нейкую долю секунды кінулася ратавацца ў сумёцісты снег… Ачуняла толькі ў бальнічнай палаце. Ехала, ішла наведаць тату, а яго самога, знямоглага і схуднелага, падкацілі на калясцы да яе бальнічнага ложка. Зірнулі адно аднаму ў вочы і не стрымалі слёз…

Быў час, калі голас Марыі Захарэвіч гучаў штодня на хвалі беларускага радыё. Хваля тая была адна-адзіная. І ўсё, што па ёй вяшчалі, даходзіла ў кожную хату. Яе называлі каралевай радыё. А сама яна лічыла радыё сваім другім домам. Народны артыст СССР, яе аднакурснік Віктар Тарасаў неяк сказаў: «Марыя нарадзілася актрысай. Паназірайце за жанчынай, калі яна чакае дзіця, у яе вачах — сполах і шчасце. Вось гэта і ёсць Марыя, калі яна атрымлівае ролю…» А Іван Шамякін адзначаў: «Мы па праве ганарымся ёй. Увесь народ ганарыцца. Такі талент трэба берагчы…»

Тэлеграма прыляцела ад Івана Мележа: «Маша! Жадаю не залежвацца доўга…» Прыйшло пісьмо ад Уладзіміра Караткевіча. Доўгае, шчырае: «Ачуньвайце хутчэй. А мы Вас тут усе будзем чакаць, і спадзявацца на Вас, і верыць, што вялікага чалавека даў нам пан-бог…» Чытаю-перачытваю гэтыя лісты і зайздрошчу таму, іхняму часу, калі зналіся, верна сябравалі творчыя людзі. Калі пісаў аповесць пра заслужаную, народную артыстку Марыю Георгіеўну, яна расшчодрылася паказаць мне свой дзённік, прыгадала сустрэчы і размовы з Васілём Быкавым, Андрэем Макаёнкам. Божа, у яе,

Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.

Фота БелТА.

Марыя Захарэвіч чытае вершы Янкі Купалы.

як руплівай пчолкі, назбірана ў душы столькі чалавечага мёду, што хопіць яшчэ не на адну аповесць.

Марыя Захарэвіч была на сцэне камісарам баявога карабля, багатай памешчыцай, шматдзетнай кабетай, удавой, дэпутатам, падпольшчыцай, Альжбетай, маці Паўлінкі. У марах засталася Ніна Зарэчная з «Чайкі» Чэхава. Не знайшлося смелага рэжысёра. А яшчэ Марыя Георгіеўна марыла сыграць Кацярыну ў «Навальніцы» Аляксандра Астроўскага. Што прываблівала яе ў гэтых гераінях? Яны кахалі і хацелі кахаць, былі гатовы да высокага пачуцця, не цярпелі фальшу, падману, няшчырасці. У іх вобразах Марыя Георгіеўна Захарэвіч бачыла сябе.

Быў час, калі голас Марыі Захарэвіч гучаў штодня на хвалі беларускага радыё. Хваля тая была адна-адзіная. І ўсё, што па ёй вяшчалі, даходзіла ў кожную хату. Яе называлі каралевай радыё. А сама яна лічыла радыё сваім другім домам. Народны артыст СССР, яе аднакурснік Віктар Тарасаў неяк сказаў: «Марыя нарадзілася актрысай. Паназірайце за жанчынай, калі яна чакае дзіця, у яе вачах — сполах і шчасце. Вось гэта і ёсць Марыя, калі яна атрымлівае ролю…» А Іван Шамякін адзначаў: «Мы па праве ганарымся ёй. Увесь народ ганарыцца. Такі талент трэба берагчы…»

Марыю Георгіеўну ахвотна запрашалі на здымкі фільмаў. Віктар Тураў — да экранізацыі рамана «Людзі на балоце». Яе заманілі ў свае фільмы рэжысёры Віталій Чацверыкоў, Міхаіл Пташук, Дзмітрый Зайцаў, Барыс Сцяпанаў, Вячаслаў Нікіфараў, Юрый Цвяткоў. Дубліравала на беларускую мову Людмілу Гурчанку ў фільме «Карнавальная ноч», ролі ў фільмах «Знак бяды», «Маці ўрагану» і шмат іншых.

Марыя Георгіеўна свая і сярод паэтаў. У дзяцінстве і юнацтве дыхала адным паветрам з Максімам Танкам. Іх вёскі, Навасёлкі і Пількаўшчына, не так ужо і далёка адна ад адной. Злучаны шумлівымі барамі, зялёнымі нівамі, ласінымі сцежкамі, спевамі жаўрукоў. Спавіты ў адным сузор'і азёраў, імя якому — Нарачанскі край. На творчым вечары Максіма Танка чытала Марыя Захарэвіч верш паэта пра маміны рукі:

Іх цалавала зямля
Сваімі пясчанымі вуснамі
І каласамі;
Неба спякотай, вятрамі,
дажджамі
Іх цалавала…

У гэты міг трэба было бачыць і чуць актрысу, адчуваць дыханне слухачоў. У кожны паэтычны радок яна ўкладвала нешта сваё, жаночае, магічнае, і верш набываў новыя мускулы, моцнае гучанне.

На кніжнай паліцы, у хатняй бібліятэцы Марыі Георгіеўны — кнігі з аўтографамі Пімена Панчанкі, Аркадзя Куляшова, Петруся Броўкі, Эдзі Агняцвет, Максіма Лужаніна, Еўдакіі Лось, Ніла Гілевіча, Анатоля Вярцінскага, Генадзя Бураўкіна, Раісы Баравіковай. Рыгор Барадулін пра яе:

Чытае вершы Захарэвіч,
Нібы сыходзіш на зямлю.
І звечарэеш,
Захварэеш
Жаданнем выгукнуць:
— Люблю!..

Яе, сапраўды народную, любілі і любяць, бо яна прывабная, добрая, шчырая, інтэлектуальная, сонечная, сціплая, працавітая, душэўная, настойлівая, эмацыянальная, мілая, абаяльная, даверлівая, цярплівая, галасістая, чуйная: «Я — актрыса, і ў палітыка мяне ніхто не пераробіць. Гэта іншая сфера дзейнасці. Мяне ж хвалюе разабрацца ў сутнасці чалавека, яго жыцця. Перажываю, што з тварэў людзей знікае радасць, весялосць…» — гаварыла яна.

Марыю Георгіеўну ведаюць студэнты ўніверсітэта культуры і мастацтваў, дзе яна як прафесар вучыла моладзь майстэрству сцэнічнай мовы. Нейкі час, калі была вольнай ад роляў у Купалаўскім, працавала рэжысёрам-пастаноўшчыкам у Маладзечанскім абласным драмтэатры. Поспех рэжысёра замацавала ў сваім тэатры — паставіла п'есу англійскага драматурга Маё Саймана «Інструкцыя па выжыванні сталых людзей». У рэпертуар увайшла з назвай «Я цябе не пакіну». Ён стаў сюрпрызам для гледачоў, крытыкаў і нават для купалаўцаў. На сцэне ўсяго дзве гераіні, але якія! Марыя Захарэвіч і Наталля Гайда. Спектакль атрымаў міжнародныя ўзнагароды. Ён заканчваецца пажаданнямі гераінь: «Трэба жыць!.. Будзем жыць!..»

Давайце ж і мы ад чытачоў «ЛіМа», усёй творчай інтэлегенцыі Беларусі пажадаем шаноўнай юбілярцы

Фота з сайта kupalauski.by

Сцэна са спектакля «Безыменная зорка», 1973 г.

Марыі Георгіеўне Захарэвіч такога ж аптымізму на шмат, шмат гадоў. А вось што яна сама сабе жадае ў сваіх дзённікавых запісах: «Хачу, каб гледачы выходзілі з тэатра са слязамі. Але каб вочы вільгатнелі не ад жалю, перажывання, спачування да герояў (хаця і гэта добра!), а каб то былі слёзы ачышчэння, захаплення ад сустрэч з высокім мастацтвам. Мала абмываецца наша душа ўзвышаным, чароўным. Трэба абараняць у чалавеку ўсё чалавечае».

Марыя Георгіеўна ўмее трымаць пяро. Умее выношваць у душы словы. Застаецца толькі шкадаваць, што яна не піша мемуары, не занатоўвае ўспаміны пра людзей, з якімі ішла па жыцці, пра падзеі, сведкамі якіх была. Хочацца спадзявацца і верыць, што яна знойдзе калі-небудзь час, пакладзе перад сабой стос паперы, і — ажывуць думкі, перажыванні, радасці і трывогі адной з яркіх нашых сучасніц, адной з найпрывабнейшых жанчын, у вобразе якой бачыцца наша Беларусь — белая і чыстая.

І напрыканцы два бліц-пытанні юбілярцы:

— Чаго вы яшчэ хацелі б у жыцці дасягнуць ці дачакацца?

— Дачакацца таго часу, калі не будзе на свеце зла, зайздрасці, войнаў. Калі людзі сапраўды будуць як браты і сёстры.

— Вашы пажаданні гледачам.

— Каб ім хацелася бываць у тэатрах. Каб іх душы напаўняліся дабрынёй і любоўю.

Уладзімір ЛІПСКІ

(Ня)шчасце кахання і самоты

Калі чытач захоча адпачыць ад пераднавагодняй мітусні, неспрыяльнага надвор'я ці надакучлівага інфармацыйнага шуму, няхай возьме ў рукі выданне, пра якое будзе ісці гаворка далей. Кнігу прозы пра маладую пару чалавечага жыцця, пра шчасце любіць і кахаць прапаноўвае Выдавецкі дом «Звязда». Зборнік Алеся Жука пад назвай «Сок манга», які пабачыў свет сёлета, складаецца з апавяданняў і аповесцей розных часоў. Расказваем пра думкі і пачуцці, што выклікае гэтая кніга.

Сакавітыя і лаканічныя апісанні самоты праз стан прыроды — сярод вартасцей новага зборніка Алеся Жука. У апавяданні «Жонка героя» сюжэт пра адзінокую ўдаву завяршаецца адлюстраваннем цяжкай ночы гераіні: «Вецер разагнаў хмары, і над зямлёю плыла асенняя ноч, абмытая сумным, халодным месячным святлом. Пасярод лагчыны, што пачынаецца ад самае яе — канцавое — хаты, роўным лускавіннем блішчэла сажалка, і над ёй хіліліся ў наклоне зламаныя старыя вербы, нібыта цягнуліся кашчавымі рукамі галля да месяца, што нерухома застыў далёка ад берага. За сажалкаю ўзбіраўся на ўзгорак чорнымі нагамі клёнаў стары парк, з дрэў якога час ад часу зрываліся і трапяталі на ветры, летучы да сажалкі, адзінокія дрыготкія лісцікі, нібы пісьмы, поўныя адчаю і невыказнага суму, пісьмы, якім ніколі нікуды не даляцець, ніколі не быць прачытанымі…» Гэты ўрывак — адзін з многіх падобных, якія перадаюць пачуццё неўладкаванасці чалавека ў жыцці, адчуванне няўтульнасці і душэўнай пустэчы. Ілюстрацыяй становяцца творы «Дачны туман», «І сніцца сон…», «Сок манга», «Эцюды вяртання» і многія іншыя. Як вынікае, адзінокага шчасця ў сусвеце Алеся Жука не існуе.

Аднак аўтар канцэнтруе ўвагу на тым, што водгукі стану адзіноты час ад часу можа пачуць любы, напрыклад, калі зрушылася «шчаслівая душэўная раўнавага». У цёплым апавяданні «Сонечны снег», прысвечаным брату Лёню, Алесь Жук прыводзіць трапны вобраз-сінонім трывожнасці: калі нават у прыветным хатнім цяпле нібы стаіш сярод зімовага поля.

Кніга так ці інакш прымушае засяродзіцца на чымсьці сваім, звярнуць увагу на хуткаплыннасць часу, падумаць пра нешта такое простае і значнае:



як адыходзіць маленства, мінае маладосць, падыходзіць сталасць — і неяк заўсёды са шматлікімі справамі і турботамі, з рэдкім ці частым роздумам пра сябе ў імклівым жыцці. Гэтыя разважанні могуць быць сапраўды адметнымі, а часам вельмі простымі і зусім не новымі: «Сонечна мігцела мора, плыў параходзік, мяняліся, плылі па гарах сонечныя жывыя фарбы, няўлоўныя, мабыць, і вопытнаму воку мастака ў сваёй цякучасці і насычанасці. Востра адчувалася і вечнасць каменных аграмад, і вады, і часовасць, слабасць маленькага, беленькага, як трэсачка, параходзіка сярод усяго гэтага, і людзей на ім. Падумалася пра сябе самога як пра пылінку, якую невядома чаго занесла сюды, за тысячы вёрст ад усяго свайго і быццам і ад самога сябе. Але нікуды не ўцёк, чамусьці пераварушваецца ў душы ўсё жыццё, не хоча душа згаджацца і прызнавацца — што было, тое прайшло, і нічога ўжо не пераменіш…» (аповесць «І сніўся сон…»).

Пры гэтай любові да апісання настрою прыроды і адпаведанага ёй стану душы чалавека відаць, што аўтару не вельмі даспадобы доўгія дыялогі (гаворка толькі пра апавяданні, бо да аповесцей гэта не адносіцца). Ён выхоплівае некалькі неабходных рэплік, каб паказаць стасункі паміж персанажамі: ці блізкія яны, ці даверныя, ці цёплыя. Астатняе — справа ненавязлівых павольных адлюстраванняў, за якімі хаваецца нешта большае, чым проста прыгожыя словы, з дапамогай якіх Алесь Жук трансліруе карцінку свету і самога сябе ў гэтым свеце. Гэтая своеасаблівая метафарычнасць заўсёды прымушае дадумваць нешта сваё, аналізаваць і станавіцца суаўтарам.

Вельмі часта ў зборніку «Сок манга» побач з самымі рознымі гісторыямі людзей ідзе размова пра каханне, як правіла, балючае, горкае і, натуральна, непадуладнае нікому. І, трэба сказаць, цяжкія хвіліны гэтага стану паддаюцца апісанню пісьменніка лепей, чым шчаслівыя. Варта параўнаць:

«— Ты ж толькі за намі не ўздумай ехаць, — наказала яна.

І Голуб не разумеў, ці яна гаворыць сур'ёзна, ці хоча пахваліцца перад сваімі спадарожніцамі — трыма вясковымі жанчынамі, — як ён кахае яе. Ён адчуў, што яму становіцца горача і хочацца закрыць рукою прыгожы белазубы рот.

— Ладна, — толькі і знайшоўся адказаць ён і асцярожна зачыніў дзверцы» (апавяданне «Водсветы зорак»).

І крыху дзіўнаваты, але ўвогуле нічым не прыкметны наступны ўрывак: «Іграліпавольнае танга. Ён не адчуваў Веру, толькі лёгенькі дотык яе грудзей і свежы дзявочы пах мытых валасоў. Ад гэтага паху, здавалася, усё больш і больш пачынала кружыцца ў галаве. Трэба было пра нешта гаварыць, але не знаходзіліся ні словы, ні пра што гаварыць. Ён адчуваў сябе нечакана вялікім і дужым і стараўся як абараніць, атуліць Веру рукамі, і гэтае адчуванне яе побач не давала яму прыдумаць тыя патрэбныя, простыя і лёгкія словы. Павінен быў хутка кончыцца танец, і гэтая думка пужала яго, і ён не мог звязаць хоць некалькі слоў» («І сніўся сон…»).

Катэгорыя часу гэтай павольнай па сваёй сутнасці прозы заслугоўвае асобнай гаворкі. Які б твор чытач ні адкрыў — крыху складана зразумець, што перад ім: ці то хрушчоўская адліга, ці то эпоха «застою», а што гэта перыяд СССР — дакладна (дарэчы, пытанне пра месца дзеяння не паўстае: улюбёнае месца дзеяння пісьменніка — вёска, што, вядома, невыпадкова). Ніякіх намёкаў на сучаснасць няма, хіба пры жаданні тыя ці іншыя гісторыі, дзе адсутнічаюць канкрэтныя адзнакі часу, можна з нацяжкай аднесці да дня сённяшняга ці хаця б учарашняга. Гэта здзіўляе: усё ж у зборніку, які выйшаў сёлета, хацелася б убачыць погляд на жыццё чалавека цяперашняга веку. Прытым гэтую заўвагу можна лічыць часткова пабочнай: усё ж Алесь Жук не разважае пра сацыяльна-палітычнае становішча краіны ў розныя эпохі, не дае ацэнку тым ці іншым з'явам мінулага (яны хоць і ўплываюць на існаванне герояў, але не вельмі істотна),

Кніга так ці інакш прымушае засяродзіцца на чымсьці сваім, звярнуць увагу на хуткаплыннасць часу, падумаць пра нешта такое простае і значнае: як адыходзіць маленства, мінае маладосць, падыходзіць сталасць — і неяк заўсёды са шматлікімі справамі і турботамі, з рэдкім ці частым роздумам пра сябе ў імклівым жыцці. Гэтыя разважанні могуць быць сапраўды адметнымі, а часам вельмі простымі...

не кажучы ўжо пра сучаснасць. Клопат пісьменніка — паказаць лёс чалавека, адлюстраваць яго часам у найгоршыя часіны. Найлепшым жа (з агаворкай, што падзеі гісторыі тут сыгралі значную ролю) падаецца адно з першых апавяданняў у зборніку пад назвай «Жонка героя», найбольш шчымлівае, дакладнае і выразнае.

Яўгенія ШЫЦЬКА

Паміж аўтарам і чытачом

Існуе міф пра тое, што ў беларускай літаратуры пішуць пераважна пра вайну і вёску. Убачыўшы ў праграме чарговую тэму, звязаную з вайной або вёскай, настаўнікі цяжка ўздыхаюць, а вучні сумуюць. Пра гэта ўжо ўсё напісана! Чым беларуская літаратура можа зацікавіць і без таго пераборлівае сучаснае пакаленне? Разбяромся на прыкладзе твора Васіля Ткачова «Мішэнь».

Кніга выйшла ў 2020 годзе ў Выдавецкім доме «Звязда» і складаецца з некалькіх вельмі розных, але аднолькава дыдактычных твораў. Пры тым, што прызначана ў першую чаргу дзецям старэйшага школьнага ўзросту, яна можа быць павучальным чытвом і для сярэдніх школьнікаў, а некаторыя творы з мінімальнай адаптацыяй падыдуць і для пазакласнага чытання ў пачатковай школе.

Кніга складаецца з трох аповесцей, некалькіх апавяданняў і п'есы, якія ахопліваюць розныя часавыя прамежкі і ўзроставыя этапы жыцця падлеткаў. Іх героі вучацца ў розных класах, нават у розных стагоддзях, жывуць у розных сем'ях. Але ўсіх аб'ядноўвае асяроддзе, якое імкнецца выхаваць, навучыць жыць.

А часам навучыць асяроддзе спрабуюць і самі дзеці. Яны адстойваюць строгія маральныя прынцыпы, якія ўжо засвоілі, і часам больш прадпрымальныя, чым дарослыя. Напрыклад, у творы «Скачы ад печы, жэўжык!» дзеці часцей вельмі востра рэагуюць на несправядлівасць і абараняюць маральныя прынцыпы не толькі свае, але і, напрыклад, суседкі Раісы, якая абяцала дачакацца свайго каханага з вайны. Але да яе

пачаў заляцацца прыезджы танкіст. Колька і Петрык спрабуюць выправадзіць жаніха з вёскі ўсімі магчымымі спосабамі...

Пры тым, што самі сюжэты твораў даволі класічныя, начынне разнастайнае і мае вельмі яскравыя, нетыповыя элементы. Як прыклад — непасрэдны набор герояў і іх сацыяльныя становішчы. Вар'ятка з паленам, танкіст-гарманіст, дырэктар завода па вырабе дзіцячага шампанскага — усё гэта толькі паверхня незвычайнага, што можна знайсці ў творах Васіля Ткачова.

Калі аўтар піша пра Вялікую Айчынную вайну, не малюе ідэальную карціну герояў-абаронцаў. У яго творах свет рэальны, аб'ёмны — са сваімі хібамі і вартасцямі, з людзьмі як сумленнымі, так і здраднікамі або выхваленцамі. Нават у характары аднаго чалавека, хай ён і не галоўны герой, В. Ткачоў паказвае абсалютна розныя бакі яго сутнасці. Так, свет, у якім растуць галоўныя героі, робіцца сапраўдным, каструбаватым, са сваімі выбаінамі і перашкодамі, якія трэба пераадолець маладому пакаленню.

Мова Васіля Ткачова своеасаблівая і ў некаторых чытачоў можа выклікаць настальгічныя пачуцці. Аўтар часта выкарыстоўвае выразы з народнага маўлення, не тыпова літаратурныя, а жывыя, гутарковыя. Некаторым яны могуць падацца асабліва блізкімі, знаёмымі, сваімі, што таксама змяншае адлегласць паміж аўтарам і чытачом. Увогуле, мова твораў вельмі лёгкая, даступная для таго, каб чытаць кнігу дзе заўгодна: у транспарце, на вуліцы, у чарзе — там, дзе нельга максімальна засяродзіцца на значэнні слоў. Плюсам кнігі стала яе кампазіцыя. Нават вялікія аповесці разбіты на главы, якія дазваляюць успрымаць твор часткамі, пры гэтым не губляючы сутнасць тэксту, бо кожная з глаў сюжэтна і кампазіцыйна завершана.

Мэтавай аўдыторыяй кнігі хутчэй за ўсё стануць ужо дарослыя. Для сучаснага ўдумлівага пакалення старшакласнікаў гэтыя творы таксама могуць быць карыснымі як павучальны, дыдактычны матэрыял, прадмет разваг і аналізу мінулага...

Кацярына ТАРАСАВА

«Ты нібыта ў дзяцінства далёкае вернешся…»

Паэтычны зборнік «Родны бераг» Тамары Кручэнкі быў выдадзены па выніках абласнога літаратурнага конкурсу «Праваслаўе — мая надзея!», заснаванага Гомельскай епархіяй і Гомельскім абласным аддзяленнем Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Вершы Тамары Кручэнкі — ураджэнкі Мядзела, лаўрэата многіх літаратурных прэмій, у тым ліку і міжнародных, можна ахарактарызаваць адным выразам: творца адлюстроўвае праўду жыцця.

І такая адзнака далёка не выпадковая. Прыйшла ў літаратуру Тамара Віктараўна праз журналістыку. Пачынала ў «Гомельскай праўдзе», затым перайшла ў «Наватар» (ведамасную газету гомельскага шклозавода), потым вярнулася зноў у абласную газету, дзе шчыруе і дагэтуль. Галоўная тэма яе творчасці — чалавек працы.

Бацькі навучылі яе паважаць людзей, якія жывуць, што называецца, з мазаля, а ў многіх з іх няпросты жыццёвы лёс. Тамара ўмела кожнага выслухаць і паспачуваць, узяць на сябе чужы боль. І тады выпырхвалі з яе сэрца, як птушкі на волю, кранальныя артыкулы, якія з удзячнасцю прымалі чытачы. Але натуры па прыродзе паэтычнай, выхаванай на беразе чароўнай Нарачы, дзе нават самі нябёсы блаславілі яе на ўсё жыццё сеяць словы ў радкі, карцела дзеля гэтых людзей зрабіць нешта большае. І творца пакрысе спрабавала зарыфмаваць свае пачуцці.

Нешта атрымлівалася добра, нешта з напісанага не падабалася, таму і не спяшалася з абнародаваннем, бо сур'ёзна ставілася да ўласнага паэтычнага радка. Калі за плячыма займела багаты жыццёвы вопыт, асмялела і яе паэзія. І вельмі хутка вершы прабіліся да чытача і палюбіліся яму. Адзін за другім выходзілі яе паэтычныя зборнікі «Край бацькоўскі», «Ад берагоў Дзясны да Сожа», «Прысвячэнне». Тамара Кручэнка не проста паэтэса, а грамадзянін сваёй Беларусі, дзе «...дыхаецца вольна, на ўсе грудзі, вышэй і неба восеньскага хмары...», дзе «дыяментамі росы на жолабах траў, завушніцы бярозак, каралі з ігліцы...» Яна любіць родны край, свой «кут радзінны», верыць у «дзівасіл Беларусі — бацькоўскую мову».

Нельга раўнадушна адрэагаваць на гэтыя, здавалася б, простыя радкі:

Нібы з паверха ў рай ляцела,
Нібы душою было і цела.
Ляцела цётка ў свае Прыбыткі,
Каб там падвесці жыцця здабыткі.
Труна як човен пасярод хаты,
Асірацелай і небагатай.
Галосіць вёска: няма Аксінні!
Якою маці была для сына!
Хавае ж бабку адна ўнучка…
Сын не прыехаў: прапіў палучку.
(«Памяці бабулі Аксінні»).

Паэтэсу, прынамсі, вельмі хвалюе, што сённяшняя моладзь сама сябе «…абабрала. І душу не трывожыць тваю // Боль ніякі і клопат пра маці…» А маці ж аддала дачушцы разам з усім матэрыяльным самае вялікае багацце: «Дабрыню ўвесь век аддаю», толькі «яе ты не хочаш забраці»:

Затуляю ад бедаў, трывог,
Ад няўдалых сяброў і ўчынкаў,
Ты ж цураешся родных дарог
І нябёс-васількоў, аблачынак.
Забываеш свае карані
І клады, дзе бабуля й дзядуля…
Барані цябе Бог, барані
Ад вар'яцкае долі разгульнай.
(«Малітва маці»).

Дапытлівы чытач знойдзе ў зборніку вершы на духоўную тэматыку, радкі, прысвечаныя гераічнай барацьбе беларускага народа супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны, якія нікога не пакінуць раўнадушнымі.

Шмат і вершаў-прысвячэнняў. Пранікнёныя радкі створаны ў вянок памяці Віктара Вятошкіна, поўнага кавалера ордэна Славы, ганаровага грамадзяніна горада Гомеля і вобласці, Паліны Калашнікавай, удзельніцы Вялікай Айчыннай вайны. Кранаюць вершы пра нялёгкі пасляваенны лёс салдацкіх удоў, прысвячэнні маці і калегам. З цікавасцю чытаюцца пераклады вершаў паэтаў Расіі — Валянціна Дзінабургскага, Віктара Валодзіна, Уладзіміра Сарочкіна, Валянціны Крысанавай, Галіны Конюхавай, Ганны Перавозавай.

Як мне падаецца, самыя шчымлівыя, пранікнёныя словы — аб нарачанскай зямлі, дзе нарадзілася паэтэса, і той зямлі, якая дала ёй своеасаблівы жыццёвы стрыжань:

Табе прывітанне, мой край неабдымны,
Я з поўдня вязу ад самога Палесся.
І чую пах юшкі, падкопчанай дымам,
І голас спрадвечнай бабулінай песні.
(«Дарога дадому падасца далёкай…»).

А гэты край — ад Прыпяці да Сожа —
На карце, бы бацькоўская далонь…
О, Гомельшчына, ты — маё натхненне,
Зямля сяброў, мой чалавечы лёс…
Ступае ўжо ўнука пакаленне
На бераг Вечнасці, на Сожа плёс.
(«Гомельшчыне»).

Перакананы, «Родны бераг» Тамары Кручэнкі знойдзе свайго чытача. А за гэтую творчую сустрэчу трэба дзякаваць і арцыбіскупу Гомельскай епархіі Стэфану, пры падтрымцы якога выйшаў зборнік.

Уладзімір ГАЎРЫЛОВІЧ

Бальшак ад пункта А да Б

«Шукаю і знаходжу…» — пад такой назвай пабачыла свет у выдавецтве «Медысонт» кніга Ірыны Тулупавай. У заяўленай аўтарам паэтычнай серыі «У палоне пачуцця» гэтае выданне другое па ліку. Дала ж пачатак серыі кніга «Чую і адгукаюся». Удалая назва, безумоўна — поспех для творцы. Лаканічна, ёмка, інфарматыўна і, вядома, вытрымана. Словы на вокладцы вітаюць і адначасова інтрыгуюць. І калі заглыбіцца ў асобу творцы — пошук для паэтэсы ці не метафара самога жыцця?

Першае, на што звяртаеш увагу, — адметнасць паэтычнага голасу. Голас аўтара запамінальны, раз пачуўшы, яго не зблытаеш з іншымі. Такая асаблівая паэтычная манера ўласціва хіба што Юрку Голубу ды Знічу.

Другое — смеласць аўтара. Удосталь наталіўшыся верлібрам адной з самых складаных форм арганізацыі тэксту ў мінулай кнізе, творца не дае сабе паслаблення і ў новай. Зварот да танічнага верша дазваляе паэтэсе больш шырока раскрыць выяўленчыя магчымасці слова, а таксама ўраўнаважыць два пачаткі: мужчынскі і жаночы. Паводле аўтарскай задумы, першы з іх — халоднае рацыё. Сучаснае, геаметрычнае, з «мазаікай вокнаў», з «электронным асадкам» (падсвядомы зварот да Замяцінскага «Мы» ці «Пецярбурга» Андрэя Белага). Адпаведна, жаночы першапачатак — глыбінны, інтуітыўны, настоены на чарах міфалагічнай Ліліт, дзе дождж, як колісь вайдэлотка замовамі, змывае чужыя сурокі. На такіх жа шалях у целе кнігі штодзённа-бытавое і казачнае, пачуцці і абавязак, летуценні і рэаліі.

Кампазіцыя кнігі нескладаная: творы змешчаны ў храналагічным парадку. Але прысутнічае тэматычная разбіўка: «Слова пра Жанчыну», «Магія рэчаў», «Успаміны», «Першароднае» і інш.

За тэкставыя дужкі вынесены шырыня інтарэсаў, інтэлектуальны ўзровень, чытацкія прыхільнасці паэтэсы. Асацыятыўны верш — «Дачная ісціна», гульня з сэнсамі ў «Графскіх развалінах», «Чытаю Караткевіча».

Аўтарам прадмовы выступіў Віктар Гардзей — яшчэ адзін прыемны бонус для чытача.

З недахопаў — мізэрны тыраж. Ці зноў развага: боскі пачатак і жыццёвы марафон, дзе ўсё менш і менш месца Паэзіі?..

Сусвет ляціць. Гудзе вакзал,
Пускае ў вандроўку летуценні.
Канцэрт мірскі чакальных зал:
Сустрэчам — гімн, расстанням — шапаценне.

Іна ФРАЛОВА

Не вельмі «светлыя згадкі» пра *згадаць* і *ўзгадаць*

Заўсёды, самастойна абіраючы тэму чарговай нататкі, імкнешся ў нечым дапамагчы і аўтарам пры напісанні твора, і рэдактарам пры падрыхтоўцы яго да абнародавання. А вось сённяшні матэрыял пісаны якраз на заказ рэдактараў, якія, паводле іх слоў, «стаміліся пераконваць аўтараў у неабходнасці правядзення праўкі».

У папярэдніх нататках ужо часткова закраналася праблема кантамінацыі моўных адзінак (так, слова *накірунак* узнікла як кантамінацыя *кірунку* і *напрамку* і не фіксуецца слоўнікамі). З гледжання рэдактара важна вызначыць, гэта свядомая трансфармацыя з мэтай выказвання аўтарскай інтэнцыі-задумы або не абгрунтаваная ніякімі прычынамі змена ў слове.

Дзве лексемы — *згадаць* ('успомніць, прыгадаць') і *ўспомніць* ('аднавіць у памяці, прыпомніць') функцыянуюць практычна як семантычныя дублеты і выразна паказваюць аднолькавую марфемную структуру: *з+гад+а+ць* і *ўс+помн+і+ць*. Да каранёў (*-гад-* і *-помн-*), якія звычайна ўтрымліваюць асноўную семантычную інфармацыю, далучаюцца розныя прыстаўкі: *з-* і *ўс-*. Дзеяслоў *успомніць* праз марфалагічныя забароны не функцыянуе са зменеанай прыстаўкай (**спомніць*), а вось дзеяслоў *згадаць* усё часцей сустракаецца ў форме *ўзгадаць* (прыстаўкі *ўз-/ус-* — інварыянты адной марфемы).

У чым жа прычына такой трансфармацыі? Якраз у дэрывацыйнай кантамінацыі дзвюх лексем — *згадаць* і *ўспомніць*.

«Што мне да вашай кантамінацыі? — скажа сам сабе аўтар. — Пішу так, як лічу патрэбным». Але ж друкаванае слова мусіць быць узорам для ўсіх карыстальнікаў мовы, г. зн. яны запамінаюць яго, спасылаюцца на яго. А даследчыкі аналізуюць яго «жыццё» ў мове, кадыфікуюць словаформы ў граматыках, даведніках і слоўніках. Цешыць тое, што ні тлумачальныя, ні арфаграфічныя, ні граматычныя акадэмічныя слоўнікі не фіксуюць кантамінаваную лексему *ўзгадаць*.

Лексема *згадаць* сустракаецца ў беларускай мове з нашаніўскага часу ўжо больш за сто гадоў. Як у вершы Максіма Багдановіча: «Зірнуў, як між валос, між хмар калматых, цёмных // Чырвоны маладзік // І ўраз *згадаў* мне рад уздыхаў прыглушоных…» ці ў паэме «Магіла льва» Янкі Купалы: «Хто там *згадаў*, што ў ёй сядзіць…» У другой палове XX стагоддзя слова фіксуецца ў творах Янкі Брыля («Ці не *згадаў* Шура яго і тады, на аўтагонках, калі кабыла панесла ў поле няўдалага ездака-каменданта?..»); Сяргея Грахоўскага («Раптоўна *згаданыя* мроі // Ў карунках пяшчотнай тугі»), Уладзіміра Караткевіча («…Не ўпаду, *згадаўшы* гэты дзень») і іншых пісьменнікаў. А як не прывесці радкі песні «Нарач» з рэпертуару «Песняроў» (словы Іосіфа Скурко, пляменніка Максіма Танка): «Мо яны *згадалі*, як ад пана злога // Нара кінулася з берага крутога…»! Не цураюцца разгляданай лексемы і навукоўцы: «Калі здарыўся ядзерны выбух на "Фукусіме-1", то адразу *згадаліся* камандзіроўкі А. Адамовіча ў Японію і Амерыку» (Алесь Бельскі); «*Згадаем* матэрыялы сярэдневяковых вясковых паселішчаў, што знаходзіліся па берагах азёр» (Вольга Ляўко).

А ўтворанае ад *згадаць* слова *згадка*? Яно ж адразу прыходзіць у галаву, калі кажуць пра «Раманс» Максіма-Кніжніка: «Зорка Венера ўзышла над зямлёю, // Светлыя *згадкі* з сабой прывяла…» Тое ж бачым у Алеся Наўроцкага: «Некалькі *згадак*»; у Рыгора Барадуліна: «Памяць развітваецца // Са *згадкамі* горкімі».

І як дысануюць з гэтымі прыкладамі наступныя: «Дацкі кароль *узгадаў*, што калісьці дацкія рыцары заваявалі эстляндыю, а таму лічыў гэтую зямлю па праву сваёй» (мастацкі твор); «Калі каманда *ўзгадала* значэнне фразеалагізма, яна атрымлівае дадатковы бал» (вучэбны дапаможнік для III класа); «Усё цікавае пахавана за гэтымі бясконцымі *ўзгадкамі* дакументаў і пастаноў» (навуковы тэкст).

Магчымасці спалучэння разгледжаных лексем могуць адрозніваца. Напрыклад, назоўнік *успамін* у множным ліку мае значэнне 'запіскі або расказы пра мінулае', што пацвярджаюць назвы кніг: «*Успаміны* пра Змітрака Бядулю», «Святло яго душы. *Успаміны* пра Міхася Лынькова». *Згадкі* ж могуць мець значэнне 'звесткі', 'факты, што міжволі ўсплылі ў памяці' і інш.: «Трохі *згадак* і думак» (Іван Мележ); «Першыя пісьмовыя *згадкі* пра вёскі Слонімшчыны»; «*Згадкі* і менавіта толькі *згадкі* пра творы У. І. Кузьменкі прысутнічаюць ва ўсіх главах, за выключэннем першых дзвюх». Калі яшчэ ўлічыць, што *згадаць* і *ўспомніць* семантычна супадаюць з *прыгадаць* і *прыпомніць*, то ёсць з чаго выбіраць.

Кожны аўтар тэксту любога функцыянальнага стылю, беручыся за асадку або ўладкоўваючыся перад клавіятурай дэсктопа ці ноўтбука, імкнецца найлепшым чынам перакласці свае разумовыя дзеянні ў вербальную форму, каб наладзіць эфектыўную камунікацыю з умоўным спажыўцом. Варта нагадаць, што яе вельмі лёгка разбурыць і страціць давер чытача, калі не прыслухоўвацца да карысных парад і матываваных прапаноў рэдактара.

Пятро ЖАЎНЯРОВІЧ

Памяць перадам я сыну...

Анатоль ЗЭКАЎ

Дзяды

Мае дзяды, Цімох з Абрамам,
не дачакаліся вы ўнукаў.
Вас смерць раней нашмат забрала,
чым я у гэты свет пагрукаў.
На вашых не сядзеў каленях,
не казытаў бародаў вашых,
ды дзякуй вам праз пакаленне:
Цімоху — за дачку Наташу,
Абраму — за сынка Міколку.
Яны, тады і самі дзеці,
пасля ўжо сталі мужам-жонкай,
каб неўзабаве я на свеце
з'явіўся прадаўжэннем роду
(бацькі ўжо ўнукаў песцяць самі).

Гляджу ў альбом, дзе вашы фота, —
нібыта размаўляю з вамі.

Радня

Цётка Таня. Дзядзька Хведзя.
Брат Пятро. Сястра Настасся.
Гэта ўсё мае суседзі.
Для мяне яны — радня ўсе.

Дзед Андрэй. Бабуля Каця.
Кум Васіль. Кума Адарка.
У любой вясковай хаце
мне і чарка ёсць,
і скварка.

Пра сябе

Маё слова, надта мляўкае,
перад ветрам сцюжным стулена.
Пачытаю лепш Бураўкіна,
пачытаю Барадуліна.

* * *

На чорны дзень заўсёды
хтось нешта пакідае.
Сябе паменш расходваць —
ў іх тактыка такая.
А я жыву адкрыта,
пра чорны дзень не ўспомню.
Жыву я так, нібыта
мой чорны дзень сягоння.

Айчына

З Айчынай развітацца немагчыма,
як немагчыма і прадаць.
Айчыну
перадам я сыну,
каб мог свайму ён перадаць.

У шпіталі

Са шпітальнага акна, звысоку,
я гляджу на парк скрозь ліхтары.
Хоць унізе дождж ідзе і мокра,
толькі ўсё-ткі лепш там, на двары.

І палата там не прыгнятае,
і пад ветру ціхага ўскалых
нават працэдура дажджавая
з працэдур найлепшая усіх.

* * *

Замяце сцяжыны вецер,
намяце пад дах сумётаў.
Паасобку мы на свеце —
і абоім нам самотна.

За акном марозна-сцюжна,
ледзяшы вісяць, як пікі.
Паасобку дужа скрушна,
і сам свет — такі нязвыклы.

Паасобку мы,
і разам,
пэўна, нам не быць ніколі.
А зіма без нас тым часам,
раззлаваўшыся, сваволіць.

Плот

Пахіліўся плот — і мы
з бацькам ля яго шчыруем.
Дастаіць плот да зімы
і зіму перазімуе.

Што зіма і сык завей,
хай яны як ні шыпяць,
будзе плот і надалей,
цвёрда ўкопаны, стаяць.

Першакурсніца з майго юнацтва

Калідор раптам звузіцца,
калі ранняй вясной
бачу я: першакурсніца
ўпотай сочыць за мной.

І хоць позірк завельмі
сумам той аддае,
ды, відаць, наваселлe
сёння ў сэрцы яе.

Пасвятлела аж — бач! — уся.
Мар — на цэлы сувой.
Толькі я не зыначуся
і не ссохну па ёй.

Нібы конік стрыножаны
рве ў шмацціё павады,
мая памяць трывожная
мкне назад праз гады,
і зусім мне не хлусіцца,
нават болей таго,
бачу я першакурсніцу,
што з юнацтва майго.

Сінь вачэй сарамлівая,
той жа позірк услед.
Дзе цяпер ты, гуллівая?
Кім населены свет?

Сэрца зноў не спакусіцца,
успамінна трымціць.
Век, відаць, аднакурсніцу,
век, відаць, першакурсніцу
буду тую любіць.

* * *

У песнях тоне Тонеж,
а я тану ў тваіх вачах.
Ў тваіх вачах — маё бяссонне —
і гэта вывераны шлях.

У песнях тоне Тонеж,
а я тану ў тваіх руках,
а я тану ў тваіх далонях —
і гэта вывераны шлях.

Ніколі не патоне Тонеж,
а я пачаў ужо тануць
у тых вачах
і ў тых далонях,
якія мне не абмінуць.

* * *

Так вядзецца ўжо спакон,
і прыдумваць тут не мне,
што ў каханай і франтон
прыгажэйшы на сяле,
і вароты —
сонца ўсход,
нібы ў казцы
ці то ў сне.

Ад варот тых
паварот
паказалі ўчора мне.

Юрась ШАМЕЦЬКА

Неразгаданы час

* * *

Неразгаданы час знікае,
аддаляюцца халады.
Дасылаю табе, што маю:
смелы позірк замест журбы.
Словам клопатным узнікаю,
у суквецці вясновых траў
я святло сваё даваяраю
не для смутку, не для забаў...

Я святло сваё даваяраю,
каб прыціішыць агонь бяды,
госцем ветлівым узнікаю
будаваць для жыцця масты.
Ўсміхаюся — жыць няпроста...
Падуладны твайму агню,
я ў празрыстасці дзён узнёслых
словам ветлівым ажыву.

Ты ж адкінеш разлад абставін,
падаруеш сваё святло,
і душы музычныя хвалі
ператворацца ў хараство.
Рушыць разам ужо гатовы…
Не разгубімся ў забыцці,
ты мяне ратавальным словам
падтрымаеш далей ісці.

Два святла ў адно аб'яднаўшы,
мы яскравым убачым свет,
два крылы вышыню спазнаўшы,
абмінуць сутарэнні бед.
Мы шуканне сваё не спынім,
зробім попелам халады
і адчуем, як вечар дымны
падтрымае наш лёс зямны…

* * *

Душа застанецца…
ніколі не знікне…
Цяплом ці завеяй
пачуецца заўтра…
Любоў застанецца
і хутка адвыкне
ад слоў развітальных
і станецца праўдай…
Вясна застанецца…
Зноў талай вадою
нап'юцца ўсе дрэвы,
а новыя кветкі
пацвердзяць, што разам
мы будзем з табою,
як раннія птушкі,
як вечнасці сведкі.
На сцэне жыццёвых
няпростых здзяйсненняў
наш лёс заіграе
натхняльнаю скрыпкай,
ці зробіцца рэхам
няспынных падзеяў,
душой застанецца
і болей не знікне…

* * *

Хто ты, мой горад патаемны?
Здабытак,
захавання варты?
Няпросты стос маіх сумненняў,
куфэрак успамінаў даўніх?
У парку ціхім атуляюць
адхланнем цьмяныя алеі,
і да шпацыру запрашаюць
меланхалічных вуліц змеі.

Што дадасі да шчасця, горад?
Завілы вуліц рамантычных
ці збежны позірк срэбных зорак,
як дыямент, заўсёды чысты?
Я адчуваю прыцягальнасць
да цішыні квартальных плыняў,
дзе радасць думак незлічоных
ў вярэдзіве святла не стыне.

Хто ты, мой горад?
Рух жывога?
Тваёй прасторы даваяраю
і крочу вуліцай натхнёны,
нібыта тайну раскрываю.
Тут застаюся закаханым,
губляю сны, спяваю смела,
а гаманлівы шолах клёнаў
мне робіцца больш зразумелым.

* * *

Я гэты горад знаю з даўніх дзён…
М. Танк

Я горад гэты ведаў столькі дзён…
І з часам абляцеў амаль паўсвету,
шукаў натхнення тонкія каметы,
рабіўся пылам, гарадскім дажджом...
Але ад мамы чуў заўжды адно:
«Каб быць шчаслівым, беражы святло».

Я горад гэты бачыў столькі раз...
І ад'язджаў парою так далёка,
што нападала зверам адзінота,
цягнулі зноў і Шарыкі, і МАЗ...
Я памятаю, добра мы жылі...
Ў дзяцінстве ўсё былі мы «каралі»...

Агні прывабных вулічных прысад
дарылі вечаровую пяшчоту...
У лістападзе, поўным адзіноты,
глядзеў, як дрэвы сталыя дрыжаць...
Здавалася, што словы іх гучаць,
а я не ведаў, што ў адказ казаць.

Ах, Мінск мой мілы, лёсу мацярык...
Ты большым стаў і часам не пазнаеш,
ды голас вуліц чуць дапамагаеш,
а ночы хвалі абвастраюць слых...
Я слухаю эфір знаёмай мовы
і даваяраю серабранскім клёнам…

Фота Кастуся Дробава.

Чаму Дудзічы Дудзічамі празвалі

З цыкла «Тапанімічныя казкі Пухавіччыны»

Генадзь АЎЛАСЕНКА

Калі гаворка ідзе пра Дудзічы, то перш-наперш успамінаюць Дудуткі, якія размешчаны зусім побач. Гэты музей беларускай матэрыяльнай культуры карыстаецца зараз вялікай папулярнасцю ў наведвальнікаў.

Але казка мая менавіта пра Дудзічы будзе, дакладней, пра тое, як гэтая вёска назву сваю атрымала. А для пачатку адзначу, што дудзічамі, альбо дударамі, называюць тых, хто на дудцы іграе.

Дудзічы — даволі старажытнае паселішча на зямлі Пухавіцкай. Першае згадванне аб ім ажно 1600 годам адзначана, і валодалі гэтым паселішчам у той час паны Адахоўскія. А ў 1621-м прадалі яны Дудзічы пану Быхаўцу…

Такія вось гістарычныя звесткі я знайшоў. Малавата для казкі, так што давядзецца самому нештачкі прыдумляць.

А аднясу я падзеі сваёй казкі ў яшчэ больш старажытныя часы, задоўга да Адахоўскіх. Бо паселішча ж не тады ўзнікае, калі аб ім упершыню пісьмовая згадка даецца, а значна раней. Тым больш што ў 1600 годзе яно ўжо Дудзічамі называлася, а ў маёй казцы — яшчэ не!

І валодаў гэтым паселішчам у тыя далёкія часы адзін пан. Мала того, што злосным быў, помслівым, несправядлівым, але да ўсяго яшчэ і розным варажбіткам вялікую веру даваў!

І вось аднойчы варажбітка нейкая нагадала гэтаму пану, што вялікія непрыемнасці чакаюць яго ад тых, хто на дудцы іграе.

І, што вы думаеце, паверыў пан у гэтую лухту!

І адразу ж аддаў наступны строгі загад: усе дудкі ў людзей адабраць і знішчыць, а калі хто зноўку дудку змайструе і пачне на ёй іграць — такога чалавека біць бізунамі бязлітасна!

Забегалі панскія гайдукі па хатах вясковых, усе дудкі, якія знайшлі, у агонь кінулі, а жыхароў папярэдзілі, каб не ўздумалі новыя дудкі майстраваць і, крый божа, іграць на іх.

Замаркоціліся людзі, але рабіць няма чаго: супраць панскай волі не папрэш. Сумна стала ў паселішчы, а раней жа шмат хто з жыхароў вёсачкі дудку меў ды іграў на ёй без усялякай перашкоды.

А жыў у гэтай вёсачцы малады хлопец, які людскіх кароў пасвіў. Янкам хлопца звалі. І вельмі любіў гэты Янка на дудцы іграць. Выведзе, бывала, статак на пашу, сядзе на якім-небудзь адкрытым месцы на беразе ракі Пціч, паднясе да вуснаў дудку сваю і пачынае іграць. А каровы слухаюць пяшчотныя гэтыя мелодыі ды траўку сабе скубуць памаленьку. І не разбягаюцца ва ўсе бакі, у шкоду ніколі не лезуць і нават малака значна больш даюць, калі менавіта Янка іх пасвіць.

Пашкадаваў Янка дудку сваю, схаваў яе ад гайдукоў панскіх. Але ў вёсцы больш не іграў, толькі каля статка, ад панскіх вушэй падалей.

І вось аднойчы іграе ён ціхенечка і раптам чуе, нібыта хіхікае хтосьці ў яго за спінай, тоненька так, здзекліва. Азірнуўся Янка і нікога не ўбачыў. Толькі пачаў зноўку іграць — зноў за спінай захіхікаў хтосьці.

На гэты раз Янка, азірнуўшыся, змог убачыць нейкую дзіўную істоту, падобную на невялікую малпачку, але з рожкамі. Праўда, добра разгледзець не паспеў: хіхікнула яна яшчэ разочак і знікла.

А гэта быў адзін з так званых нячысцікаў — хіхітун.

Розныя вакол людзей у той час нячысцікі сноўдалі, але самымі шкоднымі былі злыдні. Як завядуцца яны ў хаце — аніколі парадку не будзе...

Дык вось, у параўнанні з такімі хіхітун вялікай шкоды людзям не рабіў, а часта нават карысным мог стаць. Праўда, ён, знаходзячыся ў чалавека за спінай, заўжды радаваўся, калі з тым штосьці нядобрае вось-вось павінна было здарыцца. Тады хіхітун пачынаў тоненька смяяцца (хіхікаць), і, пачуўшы гэты смех і рэзка азірнуўшыся, можна было гэтага нячысціка добра разгледзець. А, успрыняўшы здзеклівае хіхіканне нячысціка за перасцярогу, чалавек мог нават прадухіліць няшчасце — такой і была адзіная карысць людзям ад хіхітуна.

Але Янка, на сваю бяду, не ведаў аб гэтым. Як і аб тым, што ішоў якраз у гэты час непадалёку ад Пціч панскі цівун і пачуў ціхую мелодыю дудкі. Падкраўся цівун бліжэй і ўбачыў, што гэта пастух Янка на дудцы іграе.

Дудзічы. Сядзіба Ельскіх. Мастак Юзаф Пешка.

Цівун адразу ж да пана пабег. Так, маўляў, і так, парушыў нягоднік-пастух твой загад, пане, дудку сваю не толькі не знішчыў, але і асмеліўся іграць на ёй!

Ух, як разгневаўся пан, ажно пасінеў ад злосці. Нагамі затупаў, рукамі замахаў, паклікаў сваіх гайдукоў і загадаў ім схапіць пастуха ды адразу ж на панскі двор прывалачы. Разам з дудкай.

Гайдукі загад выканалі, а злосны пан адразу ж загадаў біць Янку бізунамі, аж пакуль прытомнасць не страціць. Дудку, вядома ж, на часткі разламалі, а потым яшчэ і ў печцы спалілі. На ўсялякі выпадак.

Адхваталі Янку так, што небарака амаль два тыдні паміж жыццём і смерцю знаходзіўся. А калі крыху ачуняў, зноўку пачаў кароў пасвіць, але ўжо без дудкі.

Прыгнаў хлопец статак на бераг Пціч, сеў на тое ж самае месца, што і раней. За каровамі сочыць, думу горкую думае… і якраз у гэты ж самы момант пачуў Янка за спінай знаёмае хіхіканне. Азірнуўся, а там хіхітун стаіць, знікаць нават не збіраецца. Але хіхікаць перастаў, а проста глядзіць моўчкі на хлопца.

Нячысцікаў людзі часта палохаюцца, але Янка хіхітуна палохацца не стаў. Не страшны ён быў, маленькі, гарэзлівы… словам, пацешны вельмі…

— Прывітанне, Янка! — кажа хіхітун. — Як справы твае?

— А то не ведаеш?! — адказвае сярдзіта Янка. — Чаго заявіўся? Мала табе таго разу было! Зноўку з гора майго пасмяяцца вырашыў?

Пакрыўдзіўся тут нячысцік, галавой рагатай заматляў адмоўна.

— І тады я не смяяўся з цябе, Янка, — кажа. — А цяпер тым больш не збіраюся! Я ў той раз цябе проста аб небяспецы папярэджваў, а ты гэтага нават не зразумеў!

— Ну, хай яно так будзе! — згадзіўся Янка. — А зараз што табе ад мяне трэба?

— Проста шкада цябе стала, — патлумачыў хіхітун. — Вось і вырашыў я адпомсціць пану вашаму за твае пакуты вялікія!

Змоўк тут хіхітун, а Янку цікаўнасць разабрала.

— Ну, і як жа ты можаш яму за мяне адпомсціць? За спінай панскай пахіхікаць?

— Потым пабачыш, — сказаў хіхітун і сапраўды пахіхікаў трошкі. А потым памаўчаў яшчэ крышачку і дадаў: — Толькі мне для гэтага дудка патрэбна. І каб ты навучыў мяне на ёй іграць.

Насцярожыўся тут Янка, зірнуў на хіхітуна падазрона.

— Паўторна мяне пад бізуны падвесці хочаш?!

А хіхітун зноўку галавой адмоўна матляе.

— І тады я цябе не падводзіў пад бізуны, а, наадварот, засцерагчы спрабаваў, — кажа. — А зараз і сапраўды жадаю пану вашаму помсту здзейсніць! Ты мне павер!

Паверыў Янка. Змайстраваў для хіхітуна дудку новую, з бузіны, паказаў, як іграць на ёй трэба.

Схапіў хіхітун дудку і кажа:

— Заўтра раніцай мая помста пачнецца! А зараз бывай, Янка, пэўна ж, не ўбачымся мы з табой больш, так што не ўспамінай ліхам!

Сказаў так і знік. А Янка зноўку пачаў за каровамі сачыць.

А назаўтра раніцай выйшаў пан з маёнтка на ганак і чуе раптам, што за спінай у яго дудка зайграла. Азірнуўся — а там нікога няма!

Нікога няма, а дудка іграе сабе ды іграе. І зноў за панскай спінай…

Карацей, у які б бок пан ні павярнуўся, за спінай яго ўвесь час мелодыя дудкі чуецца. Іграе там нябачны дудзіч і спыняцца не хоча.

Вы зразумелі ўжо, што гэта хіхітун так пану за Янку помсціць пачаў. Сам ён для пана нябачны, але гукі яго дудкі пан добра чуе.

Спалохаўся пан, варажбітку раптам успомніў, ды як закрычыць, як залямантуе нямым голасам:

— Слугі мае верныя, цівуны мае надзейныя, сюды ўсе бяжыце!

Прыбеглі слугі, цівуны, стаяць усе, на пана недаўменна пазіраюць.

А той далей крычыць-лямантуе:

— Ну, чаго стаіце, чаго раты разявілі?! Знайсці неадкладна таго, хто за маёй спінай зараз на дудцы іграе! Ды на стайню яго, ды й да смерці бізунамі захвастаць дудзіча гэтага нягоднага.

Пераглянуліся слугі, анічога зразумець не могуць. Бо хіхітун так зрабіў, што анікто, акрамя самога пана, гукаў дудкі не чуе.

А пан усё ніяк не сунімаецца:

— Шукайце яго, не стойце як асталопы! А не адшукаеце, усіх вас таксама стайня чакае!

Зебегалі тут слугі з цівунамі, замітусіліся. Носяцца, шукаюць, а што — невядома!

Шукаюць, а пан па-ранейшаму на ганку стаіць і крычыць ва ўвесь голас:

— Шукайце дудзіча! Дудзіча шукайце!

Выбегла пані з маёнтка, пачала пана супакойваць.

— Няма тут аніякага дудзіча! Здалося табе, любы!

— Як гэта здалося, калі ён усё гучней і гучней іграе?! — зароў пан на жонку і нават кулаком на яе замахнуўся. — Ці ты, можа, таксама з ім згаварылася, каб мяне са свету звесці?!

Войкнула тут жонка ды й ходу ад мужа! А пан нагамі тупае, кулакамі махае і крычыць, не спыняецца:

— Усіх бізунамі адхвастаю, усіх! Усе вы заадно з дудзічам!

Затым убег ён у склеп, зачыніўся там знутры, думае, што такім чынам ад дудкі гэтай пазбавіўся.

Як бы не так! Бо якая праблема для хіхітуна ў склеп забрацца, нават калі ён знутры зачынены.

Што там далей у іх адбывалася, у склепе гэтым, ніхто канкрэтна не ведае. Тым больш што не адразу рашыліся слугі дзверы склепа ўзламаць, каб унутр яго трапіць: баяліся ўсе пана свайго як агню. Але калі дзень скончыўся і ноч настала, занепакоілася пані, загадала людзям усё ж узламаць дзверы ў склеп.

Узламалі слугі дзверы, у склеп зайшлі. Доўга там пана шукалі, ніяк знайсці не маглі. А потым знайшлі-такі.

Сядзеў пан, скурчыўшыся, у самым далёкім куточку, трымаў дудку ў руцэ і толькі хіхікаў сабе ціхенечка. Такім і застаўся. Загадала пані выдзеліць для мужа асобны пакой, слуг для яго назначыла… Так да канца жыцця і прасядзеў пан у пакоі тым, пакуль не адышоў. Хіхікаў толькі ды дудку ў руцэ трымаў, ніяк не жадаў з ёй расстацца. Так і пахавалі пана таго з дудкай у руцэ, і казалі людзі, што доўга яшчэ на могілках па начах хтосьці нябачны на дудцы іграў. Пяшчотна так, ціха, але ў кожнага, хто мелодыю тую пачуе, ажно мароз па скуры прабягаў і валасы дуба ставалі.

А вёску гэтую пасля таго празвалі Дудзічамі, хоць доўга яшчэ аніводнай дудкі ў ёй ніхто не рабіў, бо пані, калі адзінай гаспадыняй маёнтка зрабілася, таксама пацвердзіла ранейшую забарону людзям на дудках іграць. Таму мо, што вельмі напалохала жанчыну тое, што з мужам яе раптоўна здарылася і што варажбітка не зманіла ўсё ж, а шчырую праўду пану пра небяспеку ад дудкі паведаміла.

І толькі пасля таго, як прадала пані гэты маёнтак нейкаму іншаму пану і з'ехала некуды, зноўку дудары-дудзічы ў Дудзічах з'явіліся і пачалі іграць па вечарах на дудках, як і раней. І адначасова з гэтым змоўкла нябачная дудка на могілках, дзе пан быў пахаваны, назаўсёды змоўкла.

Вы, магчыма, спытаецеся, а што ж з хлопцам Янкам адбылося далей? А нічога асаблівага. Ажаніўся ён, хату сабе паставіў, кароў не пасвіў ужо, на ўласным падвор'і гаспадарыць стаў. А таго нячысціка хіхітуна ані разу больш так і не сустрэў, дык, можа, яно і да лепшага. Бо хоць хіхітуны і могуць папярэджваць людзей аб нейкіх няшчасцях, дык лепей усё ж без іх абысціся. І без папярэджанняў такіх ад хіхітуна, а тым больш без саміх няшчасцяў.

Яраслаўль энцыклапедычны

Старажытны населены пункт на Волзе сёння рэпрэзентуецца ў многіх беларускіх даведачных выданнях. У літаратурнай энцыклапедыі «Максім Багдановіч» (Мінск, 2011) — свая адмысловая факусіроўка ўвагі: «Яраслаўль, горад у Расіі, дзе Багдановіч жыў у 1908—1916 гг. да ад'езду ў Мінск восенню 1916-га. На гэты перыяд прыпадае росквіт таленту і час інтэнсіўнай творчай працы паэта, тут канчаткова сфарміраваўся яго светапогляд».

Найноўшая практыка яраслаўскай энцыклапедыстыкі — гэта варты ўвагі вопыт лакальных даведачных выданняў, у якія ўключаны цікавыя факты руска-беларускіх культурных узаемадачыненняў.

Пачынальнікі

Адным з першых універсальных выданняў, прысвечаных гэтаму рэгіёну, была кніга Мікалая Агурцова «Вопыт мясцовай бібліяграфіі. Яраслаўскі край (718—1924)» (Яраслаўль, 1924). У прадмове да яе прафесар Валянцін Бачкароў не толькі адзначыў «каласальны даведачны матэрыял», яго «выдатна прадуманую сістэматызацыю», але і прапанаваў свае назіранні адносна ролі краязнаўчых даследаванняў у новых гістарычных умовах, калі вывучэнне далёкага і блізкага мінулага «асэнсоўваецца перш за ўсё не ў агульнарасійскім, а ў чыста мясцовым маштабе, у губернскім або абласным, што дае магчымасць значна больш паглыблена і ўсебакова правесці падобнага роду абследаванні». «Вось чаму краязнаўчы прынцып так настойліва цяпер праводзіцца і ў школьнай, і ў навуковай працы, і да яго, як да найбольш каштоўнага метаду даследавання, пастаянна звяртаюцца і практычныя дзеячы, і прадстаўнікі самых разнастайных галін ведаў», — рэзюмаваў вядомы гісторык.

Мікалай Агурцоў уваходзіў у кола найбліжэйшых знаёмых Максіма Багдановіча, напісаў успаміны пра паэта. Іх звязвала і супрацоўніцтва ў яраслаўскай газеце «Голос», і нават пражыванне па суседстве на вул. Любімскай. Аб гэтым гаворыць і дарчы надпіс на адным з экзэмпляраў «Вянка» (Вільня, 1913): «Милому человеку и товарищу по работе Николаю Григорьевичу Огурцову от автора. Ярославль. 1914—20/III».

Кнігу «Вопыт мясцовай бібліяграфіі...» можна таксама назваць першым выданнем, у якім засведчана прысутнасць Адама і Максіма Багдановічаў у культурным жыцці Яраслаўскага краю.

На хвалі вяртання

У «Матэрыялах да біяграфіі Максіма Адамавіча Багдановіча» (1923) Адам Багдановіч палічыў патрэбным адзначыць сярод іншых наступны факт біяграфіі сына: «У 1914—1915 гг. некаторы час Максім даваў урокі дзецям тытунёвага фабрыканта ў Яраслаўлі А. Дунаева». Даследчыкі практычна ніколі не засяроджвалі сваю ўвагу на гэтым эпізодзе біяграфіі класіка беларускай літаратуры. Нязвыклае амплуа: «паэт чыстай красы» — хатні настаўнік, «дарэктар». У савецкі час гэты эпізод мог быць трактаваны як супрацоўніцтва з сацыяльна варожым класам.

У пачатку XX стагоддзя яраслаўцы, можна сказаць, былі лідарамі ў справе краязнаўства ва ўсёй Расійскай імперыі. Не ў апошнюю чаргу такая слава замацавалася дзякуючы Сяргею Дзмітрыеву (1875—1949), чые «Успаміны» аб Яраслаўлі апошняй чвэрці XIX — пачатку XX стагоддзя пісаліся ў 1947—1948 гадах, але былі апублікаваны толькі ў 1999-м.

Купецкі род Дунаевых быў шырока вядомы не толькі ў Яраслаўлі. Сярод найбольш каларытных яго прадстаўнікоў — Іван Дунаеў (1842—1903), купец 1-й гільдыі, патомны Ганаровы грамадзянін, «фабрыкант усяе Русі». Некаторыя гісторыі, звязаныя з ім і апісаныя С. Дзмітрыевым, паспяхова фальклярызаваліся ў гарадскім асяроддзі. Багдановічы не маглі іх не чуць:

«Дунаеў быў жарсным аматарам коней. У яго былі і англійскія, і шведскія, і бегавыя, і біцюгі, усялякіх парод і масцяў жарабцы. Свой конны завод ён трымаў па Угліцкім тракце пад Яраслаўлем... Адзін час, не памятаю дакладна, у якім годзе, ён прывёў з Украіны, дзе ў яго былі свае тытунёвыя плантацыі ў Палтаўскай губерні, быкоў і пачаў на іх, замест коней, вазіць у Яраслаўлі на вакзалы або на волжскія прыстані (а гэта амаль праз увесь горад) гатовыя вырабы сваёй фабрыкі, г. зн. махорку ў скрынях, а назад з вакзала тытунь у лістах, г. зн. сыравіну, што прывозілася з Украіны. Але гэты "спосаб перамяшчэння на быках" забараніла яраслаўская гарадская Управа, так як быкі сваім "хуткім" ходам часта закаркоўвалі і спынялі рух па ўсёй вуліцы, дзе яны крочылі. Трамваяў яшчэ тады ў Яраслаўлі не было, аб аўтамабілях, зразумела, і паняцця не мелі».

Ва ўмовах табуіраванасці тэм капіталістычнага мінулага ўпамінанне пра купецкі род звялося да вусных гісторыі і анекдотаў. У неафіцыйнай гарадской тапаніміцы дом Дунаева стаў называцца «Чацвёра непітушчых»: балкон падтрымліваюць атланты, рукі якіх заняты гэтай справай.

Існуючую лакуну за апошнія тры дзесяцігоддзі былі закліканы ліквідаваць шэраг кніг гістарычнага, дакументальнага, мемуарнага зместу.

Універсальны навігатар

«Літаратурны энцыклапедычны слоўнік Яраслаўскага краю (XII — пачатак XXI стагоддзя)» (2018) — першы вопыт рэгіянальнага даведачнага выдання, які замацоўвае рэнамэ горада на Волзе як аднаго з найважнейшых гістарычных і культурных цэнтраў Расіі. Над ім працавалі аўтарытэтныя даследчыкі Яраслаўля і Масквы, пісьменнікі, супрацоўнікі бібліятэк, музеяў і архіваў Яраслаўскай вобласці. Складальнік і агульны рэдактар — Вольга Скібінская.

Слоўнік утрымлівае каля 500 артыкулаў пра пісьменнікаў, якія нарадзіліся ў Яраслаўскім краі або творча з ім звязаны. У кожным тэкставым блоку даюцца асноўныя біяграфічныя звесткі, пералік твораў, бібліяграфія даследаванняў, указаны фонды дакументаў, якія захоўваюцца ў мясцовых і сталічных архівах і інш. У кнізе прадстаўлены матэрыялы аб рэгіянальных перыядычных выданнях, асноўных творчых таварыствах, літаратурнай тапаграфіі. Закранута ўсё, што фарміравала культурную прастору Яраслаўскай губерні, а потым вобласці. Многія матэрыялы публікуюцца ўпершыню.

Артыкулы, прысвечаныя двум вядомым яраслаўцам — Адаму і Максіму Багдановічам, падрыхтаваны прафесарам Расійскага ўніверсітэта дружбы народаў Антанінай Шалемавай, дачкой беларускага літаратуразнаўца і паэта Алега Лойкі.

Энцыклапедычны слоўнік стымуляваў з'яўленне новых краязнаўчых (і не толькі) даследаванняў. Манаграфія Вольгі Скібінскай «Марыя Петравых: яраслаўскія праекцыі» (2020) — яркае таму пацвярджэнне. У кнізе разглядаецца роля гарадскога Саюза паэтаў у культурнай прасторы рэгіёна, фарміраванні літаратурнага асяроддзя Яраслаўскага краю канца XVIII — першай трэці XX стагоддзя. Адам і Максім Багдановічы таксама не абыдзены ўвагай.

У прадмове аўтарам адзначана: «Праца, праведзеная намі і нашымі калегамі ў 2013—2018 гадах па стварэнні "Літаратурнага энцыклапедычнага слоўніка Яраслаўскага краю (XII — пачатак XXI стагоддзя)", прыкметна зрушыла акцэнты ва ўсведамленні грамадствам шматвяковай культурнай спадчыны рэгіёна: нам удалося даказаць, што вельмі значным яго складнікам нароўні з храмавай архітэктурай і яраслаўскім іканапісам з'яўляецца выкшталцоная славеснасць. Тым больш актуальнымі ўяўляюцца далейшыя навуковыя даследаванні, якія тычацца асобных персаналій — іх біяграфічнай і творчай сувязі з Яраслаўскай зямлёй, разбурэння бытавых міфаў, што часам вяршэнствуюць у грамадскай свядомасці».

Манаграфічны фаліянт

Да 200-годдзя з дня нараджэння Мікалая Някрасава (1821—1877) філолагамі Яраслаўскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя К. Д. Ушынскага падрыхтавана і выдадзена «Некрасаўская энцыклапедыя: яраслаўскія старонкі» (2021). Складальнік — Вольга Скібінская, навуковы рэдактар — Маргарыта Панамарова.

Творчасць Мікалая Някрасава добра ведаў і высока цаніў «паэт чыстай красы». Пра гэта сведчаць факты біяграфіі і творчая практыка. Адам Багдановіч уваходзіў у склад мясцовай камісіі па арганізацыі мерапрыемстваў да 100-годдзя з дня нараджэння класіка рускай літаратуры. У 1921 годзе ён наладзіў Некрасаўскую выстаўку, неаднаразова выступаў з публічнай лекцыяй «М. А. Некрасаў і яго паэзія».



У 1992 годзе ў яраслаўскім доме, дзе жыла сям'я Багдановічаў, была створана экспазіцыя — вынік сумеснай творчай працы супрацоўнікаў Літаратурнага музея М. Багдановіча (Мінск) і Літаратурна-мемарыяльнага музея-запаведніка М. А. Некрасава «Карабіха».

Пад адной вокладкай «Некрасаўскай энцыклапедыі…» найбольш поўна прадстаўлены вынікі даследаванняў за апошнія сто гадоў, гісторыя стварэння твораў вялікага рускага пісьменніка, напісаных на Яраслаўскай зямлі і на аснове мясцовых уражанняў, а таксама яраслаўскае асяроддзе пісьменніка. Новыя матэрыялы па біяграфічнай і творчай спадчыне суседнічаюць з добра вядомымі, але ў гэтым выпадку вызваленымі ад ідэалагічнай і ведамаснай кан'юнктуры. Яны аб'яднаны ў 230 артыкулаў. Іх суправаджае пашыраная архіўная і бібліяграфічная інфармацыя. Імянны паказальнік па энцыклапедыі ўключае больш за тысячу імёнаў.

Творчы калектыў павіншаваў 10 снежня, у дзень нараджэння Мікалая Някрасава, рэктар Яраслаўскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя К. Д. Ушынскага Міхаіл Груздзеў: «Выданне з'яўляецца вынікам карпатлівай працы нашых калег — яркіх і таленавітых энтузіястаў і даследчыкаў. Сапраўдны натхняльнік выдання В. М. Скібінская, навуковы рэдактар М. Г. Панамарова. Я рады і ганаруся за калег, што адужалі гэтую тытанічную фундаментальную працу, рады за чытачоў — прыхільнікаў някрасаўскай творчасці, у якіх з'явілася выдатная дапамога. Энцыклапедыя — пераканаўчае пацвярджэнне таго, што памяць аб Някрасаве жывая, удзячная, цікавасць да яго асобы і творчасці — невычэрпная…»

Літаратурная энцыклапедыя «Максім Багдановіч» (2011) — беларускі навукова-даследчы і выдавецкі вопыт, які апярэдзіў яраслаўскіх калег. Парытэтнасць апрабаванага фармату, культурнае супрацоўніцтва Мінска і Яраслаўля апошняга часу з'яўляюцца яркім сведчаннем падабенства актуальных алгарытмаў архіўна-пошуковай дзейнасці. Яны здольныя прапанаваць шырокай чытацкай аўдыторыі і навуковай супольнасці новыя знаходкі, адпаведныя часу метадалагічныя падыходы ў гуманітарнай сферы.

Мікола ТРУС,
кандыдат філалагічных навук

Гаскала… За зробленае — пахвала

Што Капыль — радзіма Мендэля Мойхер-Сфорыма, якога называюць дзядулем яўрэйскай літаратуры, ведаюць многія. Чаго не скажаш пра яшчэ аднаго выдатнага ўраджэнца колішняга мястэчка Абрама Паперну. Доўга пра яго, пісьменніка і педагога, не чуў і я. Упершыню даведаўся, працуючы над складаннем гісторыка-дакументальнай хронікі «Памяць» Капыльскага раёна, што выйшла ў 2001 годзе. Патрапіла на вочы і прозвішча Абрам Паперна. Здаецца, у нейкай публікацыі, дзе расказвалася пра жыццё Капыля ў XIX стагоддзі.

Каб больш даведацца пра яго, пацікавіўся ў вядомага беларускага пісьменніка Уладзіміра Мехава. Уладзімір Львовіч сам адкрыў для літаратуры нямала забытых імёнаў. Параіў зазірнуць у «Еврейскую энциклопедию». На свой сорам, я і не ведаў, што такая выходзіла ў дарэвалюцыйнай Расіі, з'яўляючыся «сводом знаний о еврействе и его культуре в прошлом и настоящем в 16 томах».

Сабраўся ісці ў Дзяржаўную бібліятэку БССР імя У. І. Леніна, цяперашнюю Нацыянальную бібліятэку Беларусі, як патэлефанаваў Уладзімір Мехаў. З радасцю пачуў: «У Ленінцы ёсць усе тамы. У 12-м і напаткаеце звесткі пра Абрама Паперну». Падказаў і на якой старонцы шукаць. На падставе прачытаных звестак і напісаў пра яго матэрыял для «Памяці». Пазней была і мая публікацыя ў «ЛіМе». Цяпер раскажу падрабязней пра гэтага выдатнага чалавека, пісьменніка і педагога..

Нарадзіўся Абрам Паперна ў 1840 годзе. Паколькі дзед яго быў равінам, у маленстве дасканала авалодаў Талмудам. Рана завёў сям'ю. Магчыма, і жыў бы ў родным мястэчку, ды ў Капыль трапілі ідэі гаскалы. Сустракаецца і назва хаскала. І нават аскала. Гэта рух, што ўзнік сярод еўрапейскіх яўрэяў у другой палове XVIII стагоддзя. Прыхільнікі яго выступалі за прыняцце каштоўнасцей эпохі Асветніцтва, адукацыю ў галіне свецкіх навук, іўрыту і гісторыі свайго народа.

Настолькі захапіўся ідэямі гаскалы, што ў яго жыцці ўзнікла сітуацыя, блізкая да адной з папулярных сучасных песень: «Ты куда Одиссей от жены, от детей». Ці былі ўжо ў яго дзеці — невядома. Аднак, доўга не разважаючы, паступіў у равінскае вучылішча ў Жытоміры. Вучобу прадоўжыў на педагагічным аддзяленні віленскага, якое скончыў у 1867 годзе. У 1868—1909 гг. выкладаў асновы іўдаізму ў гімназіях Плоцка і загадваў яўрэйскім вучылішчам.

Яшчэ ў юнацтве пісаў вершы. Упершыню яны былі надрукаваны ў 1862 годзе. Рана паспрабаваў свае сілы і ў крытыцы, літаратуразнаўстве. Карыстаўся іўрытам і рускай мовай. Яго вершы, літаратурна-крытычныя артыкулы з'яўляліся ў перыядычным друку, а ў 1867-м асобнай кніжкай выйшаў літаратурна-крытычны эцюд. У ім рэзка асудзіў празмерную рыторыку яўрэйскай літаратуры, выступіў супраць фразеалагічнай вычварнасці, схільнасці аўтараў да псеўдакласіцызму. На першы план ставіў эстэтычную каштоўнасць напісанага. А ў эцюдзе 1868-га гаворку канкрэтызаваў. Разважаў не пра літаратуру ў цэлым, а пра драматургію, успрымаючы яе далёкай ад паўсядзённага жыцця. Пасля апублікаваў шэраг артыкулаў пра розныя аспекты развіцця яўрэйскай літаратуры. У 1893 годзе з'явілася яго дасціпная сатыра ў вершах.

Абрам Паперна выхоўваўся на найлепшых традыцыях рускай класічнай літаратуры, цудоўна ведаў рускую мову. Хацеў, каб і роднае яму нацыянальнае прыгожае пісьменства не знаходзілася на задворках. Клапаціўся аб адукацыі яўрэйства, напісаў шэраг падручнікаў па іўрыце і ідышы. Асобныя з іх вытрымалі некалькі выданняў.

Стварыў і дапаможнік па рускай мове. Дарэчы, сам шмат пісаў і па-руску, друкуючыся ў такіх выданнях, як «Приложение к "Такармелю"», «Дно», «Восход» і іншых. Вялікай папулярнасцю карысталіся, ды і зараз не страцілі значэння, найперш як багаты пазнавальны матэрыял, яго гістарычныя нарысы. У асноўным яны пра жыццё яўрэйскіх абшчын і былі змешчаны ў «Книжках "Восхода"» у 1901 годзе. А ў другім і трэцім тамах зборніка «Пережитое» апублікаваны «Воспоминания», у якіх праўдзіва, па-майстэрску апісана жыццё яўрэйства, у тым ліку і капыльскага.

Гэтых кніг, як ні шкада, няма нават у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Пазнаёміцца з імі можна дзякуючы Феліксу Кандэлю. Фелікс Саламонавіч — суаўтар сцэнарыя, разам з Аляксандрам Курляндскім і Аркадзем Хайтам, першых сямі выпускаў знакамітага мультфільма «Ну, погоди», а таксама 19 і 20-га. Праўда, у цітрах значыцца пад псеўданімам Фелікс Камаў. Выехаўшы ў Ізраіль, стаў празаікам і гісторыкам яўрэйскага народа. Сярод яго даследаванняў і «Очерки веремен и событий и истории российских евреев». У ім ёсць і такое сведчанне: «Можно много и долго рассказывать о временах правления Николая I и о событиях той эпохи, но из этих разрозненных частностей всё равно не сложится общая картина жизни еврейского города или местечка — день за днем, событие за событием. Нужен современник, нужен очевидец, нужен выходец из этой среды, который оставил бы свои воспоминания — подробные и достоверные». Такога відавочцу ўбачыў у асобе Абрама Паперны.

Абрам Паперна ў асноўным пісаў пра яўрэяў, але разам з тым пра ўсю Беларусь, прадстаўнікі розных народаў у якой заўсёды жылі не па чыёй-небудзь указцы, а па поклічы сэрца і душы. Таму і панавала на нашай зямлі згода. Гэтаму сваёй творчасцю спрыяў і Абрам Паперна.

Дзякуючы мемуарам Абрама Ізраілевіча, можа атрымаць уяўленне пра «чисто еврейский городок» Капыль таго часу. У асноўным праз веру яго супляменнікаў. Калі ў праваслаўных быў толькі адзін храм, то «у евреев на синагогальном дворе — синагога, бейт-мидраш, клауз и молельня общества портных», а таксама дом равіна, адкрыты для кожнага. Клаўз, адзіны цагляны будынак у мястэчку, «служил молитвенным домом для почтенных копыльцев, выделявшихся знатностью рода, талмудической эрудицией, набожностью или благотворительностью. По субботам и на праздники они одевались в черные сатиновые одежды с бархатными воротниками и в меховые шапки с бархатным верхом — "штреймель". Одежды часто бывали ветхими, перешедшими по наследству от предков, шелк и бархат утрачивали свой первоначальный цвет, мех из штреймеля мало-помалу вылезал, — тем не менее, эти, как их называли, "красивые", или "шелковые люди" сознавали свое достоинство и умели внушить к себе уважение других».

Абрам Паперна.

Абрам Паперна даў вычарпальныя характарыстыкі асобным «шаўковым людзям». Стараста кагала рэб Хаімка — «сутуловатый и подслеповатый, который во время молитвы плакал, рыдал, проливал горючие слезы, за что его и прозвали «гройсе баалбехи» — «великий плакальщик». А рэб Лейзер Янкель успрымаў сябе пакрыўджаным з-за таго, што прырода «отказала ему в самом необходимом — в бороде, что он считал величайшим для себя несчастьем». Заходзіў і рэб Лейбке, якога празвалі «га-кадош», што азначае святы. Рэб Лейзерке, сын памерлага капыльскага равіна, «унаследовал от отца его соболью шапку, его лисью шубу, его набожность, но уступал ему в знании Талмуда».

А гэта ўжо звесткі аб культурным жыцці Капыля. У клаўзе была багатая бібліятэка: Талмуд, равінская літаратура, павучальныя і гістарычныя кнігі. У яўрэяў меліся і ўласныя кнігазборы. Дбалі яны і аб адукацыі. Усе хлопчыкі ад чатырох да трынаццаці гадоў наведвалі хедэры, якіх мелася каля дваццаці. Для дзяўчатак, праўда, навучанне было неабавязковым. Але яны ў большасці ўмелі чытаць малітвы і Пяцікніжжа ў перакладзе на ідыш: «Копылец не жалел ничего для воспитания своих детей; нередко бедняк продавал последний подсвечник или последнюю подушку для уплаты меламед».

У клаўзе вучыліся і прыезджыя: «"бахурим" — холостые и "прушим" — женатые, которые стекались сюда из разных городов для изучения Талмуда». Да іх мясцовыя яўрэі ставіліся дружалюбна. Калі хто-небудзь незнаёмы з'яўляўся з посахам у руцэ і клункам за спінай, яго радасна віталі. Адразу забяспечвалі «днямі» — вызначалі гаспадароў, у якіх ён па чарзе харчаваўся на працягу тыдня. Для кожнага ахвотнага вучыцца гэта было вельмі зручна: «еда у него есть, книг и свечей — сколько угодно, квартира готовая — клауз, а в кровати и подушках он не нуждается — спит на скамье или на земле, подложив под голову свой халат. Жизнь, правда, не роскошная, но зато свободная от забот — для спокойного занятия Талмудом».

Да халастых вучняў так уважна ставіліся і па іншай прычыне. Далёка не кожны мог даць дочкам пасаг. Своеасаблівым кійком-выратавальнікам нярэдка і станавіўся той, хто ў кватэры гэтага гаспадара перыядычна харчаваўся. Бацьку нявесты дастаткова было паабяцаць яму, што некалькі гадоў будзе карміць дзяцей, якія народзяцца, як магчымы зяць гатовы быў узяць яго дачку ў жонкі.

Аднак у жыцці капыльскіх яўрэяў усё было не так проста, як можа падацца. У час праўлення Мікалая «суровые меры сыпались одна за другой, одна другой страшнее и невыносимее». Жах апанаваў, калі даведаліся, што «строжайше предписывалось евреям одеваться в немецкое платье и запрещалось носить бороду и пейсы; женщинам воспрещалось брить головы и покрывать их париком».

Вынікі не прымусілі сябе чакаць: «[…] почтенным евреям бесцеремонно отрезали полы длинных зипунов, бороды гладко сбрили, а пейсы срезали беспощадно до самых корней». Хоць станавы, якому паскардзіліся, паступіў па-людску, стаў на бок пакрыўджаных: «к отрезанным зипунам пришили новые полы всё равно какой материи и какого цвета, бороды с пейсами со временем отросли, и всё пошло по-старому». Аднак не ўсё так проста заканчвалася. Прынамсі, гэта тычылася рэкруцкіх набораў. Ахвотных ісці ў войска не знаходзілася, аднак усе юнакамі, хай сабе праўдай і няпраўдай, ад гэтага нікуды не маглі падзецца. З'явіліся так званыя «лаўцы», ад якіх не ўсім удавалася схавацца.

Праўда, што паўстае са старонак згадак Абрама Паперны, прынамсі, у інтэрпрэтацыі Фелікса Кандэля, важная тым, што яна падаецца з вуснаў відавочцы таго, што адбывалася. Гэта сведчанні, як няцяжка здагадацца, Паперны-юнака, тое, што захавала яго ўчэпістая памяць ва ўзросце сталення і станаўлення. Цягам часу яно не забылася. Аднак у нечым паўстала і ў крыху іншым святле, пераасэнсаванае з вышыні пражытых гадоў. Магчыма, наведваўся ў роднае мястэчка пасля таго, як жыццёвыя пуцявіны павялі яго далёка ад Капыля. Было што і з чым параўнаць. Таму гэтыя ўражанні і розняцца. Ад захаплення да пэўнага паблажлівага стаўлення. Часам ад асуджэння да непрыхаванага здзіўлення наіўнасцю землякоў.

Але гэта праўдзівае жыццё Капыля часу, які даўно стаў гісторыяй. А ў ім, як і ва ўсе перыяды, прысутнічала ўпэўненасць, што ў будучыні ўсё будзе лепш: «[…] реб Лейбке долгим постом, молитвами и изучением кабалистических книг вычислил наконец-то время пришествия Мессии и конец страданий Израиля в изгнании. Он взял из псалма одно выражение, которое в переводе на русский язык означает — "как потоки на юге"». Прыйшоў да высновы, што адзінаццаць літар яго на іўрыце — не што іншае, як першыя літары зашыфраванага прароцтва: «Пасля смерці Аляксандра Паўлавіча будзе царствацаць нямногія дні Канстанцін, а ў дні Мікалая наступіць збавенне».

Пра далейшае гаворыцца з пэўнай доляй іроніі. Вестка аб прадказанні разнеслася па ўсёй Беларусі. Толькі і размоў было пра рэба Лейбке. Аднак Месія, як і трэба было прадбачыць, не з'явіўся: «[…] реб Лейбке потерял веру в себя, впал из-за этого в уныние и преждевременно сошел в могилу».

Абрам Паперна ў асноўным пісаў пра яўрэяў, але разам з тым пра ўсю Беларусь, прадстаўнікі розных народаў у якой заўсёды жылі не па чыёй-небудзь указцы, а па поклічы сэрца і душы. Таму і панавала на нашай зямлі згода. Гэтаму сваёй творчасцю спрыяў і Абрам Паперна. Памёр ён у 1919 годзе ў Адэсе.

Алесь МАРЦІНОВІЧ

Ахвяраваць для драпежнікаў

У Беларускім дзяржаўным маладзёжным тэатры прэм'ера па п'есе аднаго з найлепшых і найпапулярнейшых драматургаў Аляксандра Астроўскага. Галоўны рэжысёр Андрэй Гузій звярнуўся да «Апошняй ахвяры». Гэта не самы папулярны для пастаноўкі тэкст, усё ж многія сучаснікі не звяртаюць на яго ўвагі, а тыя, хто знаёмы з творам, хутчэй за ўсё бачылі таксама розныя спектаклі і экранізацыі, самую знакамітую з якіх зняў Пётр Тадароўскі. Чым жа зацікавіла «Апошняя ахвяра» галоўнага пастаноўшчыка Маладзёжнага тэатра? Што новага сказаў Андрэй Гузій?

Папячыцелі задаволены

Стваральнікі вызначылі спектакль як «гісторыю кахання, якое не спраўдзілася». Багатая дзяўчына нядаўна страціла мужа і аказваецца ў цэнтры чужых інтрыг, плётак і таямніц. А хоча яна аднаго — кахаць і быць каханай несумленным гульцом. Кароткае апісанне, зразумела, зусім не інтрыгуе, аднак мы ж ведаем, якога аўтара зноў і зноў вывучаем. «Напісаная ў канцы XIX стагоддзя п'еса Аляксандра Астроўскага неверагодна актуальная ў наш час: каханне ці грошы, выратаваць сябе ці каханага чалавека, захаваць гонар і годнасць або пражываць жыццё, нягледзячы ні на якія маральныя асновы і законы?» — такія пытанні ставяць і аўтар «Апошняй ахвяры» і галоўны рэжысёр Маладзёжнага тэатра.

П'еса была задумана ў 1874 годзе. Назва мянялася тройчы: ад першапачатковай «Ахвяры веку» драматург адмовіўся на карысць «Папячыцеляў». Канчатковым варыянтам стала «Апошняя ахвяра», якую драматург пачаў пісаць у 1877 годзе. На працу ў яго пайшло два

месяцы (толькі праз год пісьменнік завершыць знакамітую «Беспасажніцу»). Падчас напісання ў лісце Фёдару Бурдзіну, акцёру і драматургу, Астроўскі паведамляў: «Пішу п'есу, збіраю апошнія сілы, каб яе скончыць. Кранальны драматычны сюжэт п'есы, у які я паглыбляюся ўсёй душой, яшчэ больш засмучае мяне». У іншым лісце таму ж Бурдзіну, напісаным праз тры тыдні, драматург заўважае, што «п'еса рухаецца да канца, рэч выходзіць вялікая і, здаецца, сцэнічная». Прэм'ера адбылася хутка ў Малым тэатры, у бенефіс артыста Мікалая Музіля. У якасці рэжысёра выступіў сам Аляксандр Астроўскі.

Многія адзначалі, што фіналы яго п'ес вельмі часта псеўдашчаслівыя. Герояў можа асыпаць грашовы дождж, а хтосьці дасягае сваёй мэты, няхай і невысокай… Але яны, калі падумаць, такія ж сумныя, як у «Навальніцы» або «Беспасажніцы». Так і ў «Апошняй ахвяры»: галоўная гераіня Юлія Паўлаўна Тугіна вымушана стаць жонкай чалавека, якога не любіць. І яго — Флора Фядулыча Прыбыткава, разумнага і ў пастаноўцы Андрэя Гузія даволі сумленнага, гэта цалкам задавальняе. А ў канцы гучыць раманс «В лунном сиянии»…

Між тым вядома, што на тытульным лісце рукапісу п'есы аўтар акрэсліў фабулу твора: «Стары, закаханы ў маладую ўдаву, імкнецца пад выглядам заступніцтва і папячыцельства разлучыць яе з каханым маладым чалавекам, у чым і дасягае поспеху…» Здаецца, стваральнікам спектакля ў Маладзёжным удалося паказаць, што Юлія Паўлаўна — «ахвяра веку», а не аднаго гульца Вадзіма Дульчына. І на яе знойдуцца ахвотныя паглядзець. Як сказала цётка Юліі Глафіра Фірсаўна, калі стала вядома пра здраду каханага сваячкі: «Ізноў жа і тое цікава паглядзець, як яна тут будзе рукамі разводы разводзіць ды прысуды прыгаворваць. Бо, бач ты, шлюбную сукенку паехала заказваць, а тут раптам удар. Гэткага паказу хіба хутка дачакаешся?» Сучасней няма куды.

Без шансаў на выжыванне

Трэба сказаць, што спектакль, напэўна, упішацца ў рэпертуар Маладзёжнага тэатра. Тэматыка, агульны настрой, шырокае поле для акцёрскай ігры — усё гэта спрыяе цікавасці пастаноўшчыкаў і артыстаў, а таксама гледача да п'есы Астроўскага. Дарэчы, галоўныя ролі выканалі заслужаны артыст Беларусі Аляксандр Шароў, заслужаная артыстка Беларусі Наталля Анішчанка, акцёры Вольга Давыдава-Роік, Андрэй Гладкі, Яўген Лук'янаў, Анастасія Рэўчанка, Аляксандр Пашкевіч, Яўгенія Анікей ды іншыя.

Вартасць пастаноўкі ў звароце менавіта да арыгінальнага віду п'есы — камедыі. Звычайна ўсе рэжысёры, якія працавалі з тэкстам, практыкаваліся ў сур'ёзнай драме: Юрый Яромін у МХТ імя А. П. Чэхава, Міхаіл Казакоў (тэлеспектакль «Папячыцелі» 1982 года), Уладзімір Драгуноў у Малым тэатры Расіі, Пётр Тадароўскі (аднайменны фільм 1975 года). І гэта толькі тое, з чым можа пазнаёміцца сучаснік.

Ці так было зроблена знарок, ці атрымалася выпадкова, але спектакль пазбаўлены духу эпохі. Няхай веды пра гэты дух у кожнага з нас даволі фрагментарныя (толькі спецыяльная і мастацкая літаратура, розныя віды мастацтва, у тым ліку стужкі з аўтарскім поглядам на той ці іншы перыяд могуць нешта падказаць), пастаноўка часам безумоўна поўніцца інтанацыямі, уласцівымі спрошчанасці: на карысць гэтага меркавання — неадназначныя жаночыя касцюмы, немудрагелістая музыка (праўда, не заўсёды — усё ж гучыць і вальс № 2 Дзмітрыя Шастаковіча), якая, дарэчы, часам перашкаджала, асобныя сцэны (напрыклад, празмерна шумная першая размова ключніцы Юліі Паўлаўны і Глафіры Фірсаўны)… Аднак спрачацца тут было б недарэчна, бо п'еса закранае тэму сучасную (ці вечную?): з аднаго боку — грошай, стрыманага разліку і з іншага — бескантрольнага і неўсвядомленага гарачага пачуцця, якое не мае шанцаў на выжыванне ў свеце тады яшчэ чэкаў і вэксаляў (тут варта згадаць дэкарацыі, якія нагадваюць клеткі для птушак). Чаму б і не прыўнесці штосьці сваё?

Дарэчы, у гэтай п'есе, як і ў іншых творах, Астроўскі расказаў пра людзей, якія адчайна патрабуюць ад іншых ласкі, самі застаючыся подлымі стварэннямі з выдатным уменнем маніпуліраваць пачуццямі даверлівых. Рэжысёр «Апошняй ахвяры» вырашыў не адыходзіць ад такіх псіхалагічных момантаў: у пастаноўцы прысутнічаюць і катэгорыі абсалютнага зла, і зла пад маскай дабра.

Дзе яно, шчасце ўсяго жыцця?

Роля Юліі Тугіной самая складаная ў творы. Да якой пастаноўкі ні звярніся, заўсёды знойдзецца крытыка ў адрас розных актрыс. У спектаклі ж Андрэя Гузія з удавы ў выкананні Вольгі Давыдавай-Роік атрымалася сапраўднае дзіця з празмерна гучным смехам і выразнымі грымасамі — тут нават складана сказаць, колькі гераіні прыкладна гадоў. З гэтага вынікае і пытанне аб магчымасці сапраўднага кахання дадзенага дзіцяці, але гэта ўжо дэталі... Юлія Тугіна часта ходзіць з аднаго кута сцэны ў іншы, уздыхае, узмахвае рукамі і з асаблівымі прыдыханнямі чытае лісты ад каханага і разважае пра шчасце. З невялічкіх згадак не зусім зразумела, наколькі яна набожная, чым любіць займацца і г. д.

Флор Фядулыч без усялякага, як ужо згадвалася, «пад выглядам» сапраўды дабрадзейнічае і апякуе, паўстае перад гледачамі прыстойным буржуа, які і насамрэч «лішак грошай бедным аддае». Дарэчы, глядзельную залу Маладзёжнага тэатра не падкупіць: паведамленне аб шлюбе Юліі Паўлаўны і Флора Фядулыча незадоўга да фіналу ніхто радасцю не сустракае, як здаралася падчас некаторых паказаў гэтага твора на сцэне.

Нязвыкла маладая і крыклівая тут Міхеўна — у арыгінале гэта ключніца Юліі. Звяртаюць на сябе ўвагу таксама Лука Дзергачоў, якога імкнуліся паказаць маленькім і мізэрным, што цалкам удалося; Вадзім Дульчын — прыгажун, які мітусіцца ў пошуках багатай жонкі і не выглядае ў пастаноўцы рэальным чалавекам са шчырымі эмоцыямі і пачуццямі (так ці інакш, але ў процівагу яму прыгадваецца эталон гэтага тыпу героя — знакаміты Свірыд Пятровіч Галахвосты з «За двума зайцамі»); Ірына Лаўраўна, закаханая ў Дульчына, пакуль не даведваецца, што прыгажун не багаты… Герояў насамрэч шмат, аднак хочацца згадаць тых, якіх акцёрская ігра зрабіла найбольш запамінальнымі. Найперш гэта пляменнік Флора Фядулыча Лаўр Міроныч у выкананні Аляксандра Пашкевіча. Персанаж не першарадны, аднак атрымаўся такі каларытны, што змог паспяхова пазмагацца з галоўнымі за ўвагу гледача. Неверагоднай авантурысткай атрымалася і цётка Юліі Глафіра Фірсаўна, якую сыграла Наталля Анішчанка.

Сцэна «гвалтоўнага» какецтва Юліі з Прыбыткавым ключавая. Яна стаіць ледзь не ў самым пачатку, і здаецца, што публіка яшчэ не паспявае сканцэнтравацца на дзеянні і асэнсаваць усю яе адметнасць. Аднак кожны разумее, што «шчасцю ўсяго жыцця», пра якое кажа гераіня, не наканавана збыцца. Магчыма, таму ўвесь далейшы спектакль глядач назірае калі не абыякава, то спакойна. Ідзе камедыя, шмат нагод пасмяяцца. Ці варта сумаваць?

Яўгенія ШЫЦЬКА

Фота з сайта Маладзёжнага тэатра

Пасіянарная асоба

Доўгая чарада сумных навін, на вялікі жаль, не перарвалася і цяпер… Гэтым разам няшчасце спасцігла блізкіх Міхаіла Якаўлевіча Фінберга, сусветна вядомага дырыжора, народнага артыста Беларусі. Мастацкі кіраўнік і дырэктар Нацыянальнага акадэмічнага аркестра сімфанічнай і эстраднай музыкі Рэспублікі Беларусь пайшоў з жыцця на 75-м годзе. У панядзелак у Белдзяржфілармоніі адбылося развітанне з таленавітым творцам.

Жыццёвы шлях Міхаіла Якаўлевіча пачаўся ў Мазыры 21 лютага 1947 года. Моцную цягу да музыкі хлопчык выяўляў яшчэ ў раннім дзяцінстве. Бацькі, заўважыўшы жывы інтарэс сына, аддалі яго ў Мазырскую музычную школу па класе скрыпкі. У хуткім часе, аднак, Міхаіл прамяняў смычковыя струнныя на духавыя, абраўшы ў якасці свайго інструмента трамбон. З ім на плячах будучы дырыжор прайшоў і службу ў ваенным аркестры, куды трапіў пасля няўдалых спроб паступіць у вучылішча.

Зрэшты, праз дзесяць гадоў, аддадзеных арміі, Міхаіл Якаўлевіч даб'ецца-такі ўсталявання справядлівасці, перавёўшыся ў Мінскае музычнае вучылішча і скончыўшы аспірантуру па спецыяльнасці «Аркестравае дырыжыраванне»… Наступнай адукацыйнай вяршыняй у біяграфіі маэстра стаў экстэрнат Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі па класе трамбона. Праз год пасля заканчэння, у 1971-м, Міхаіл Фінберг пачаў выкладаць у Беларускай акадэміі музыкі, а таксама займацца даследчыцкай дзейнасцю.

У той жа час малады творца стаў на чале музычнага аркестра Мінскага цырка. Пад таленавітым кіраўніцтвам Фінберга калектыў дамогся рэспубліканскай славы і дасягнуў значных творчых поспехаў. Паступова аркестр са спецыфічнага цыркавога трансфармаваўся ва ўніверсальны канцэртны калектыў. На пасадзе галоўнага дырыжора сталічнага цырка Міхаіл Якаўлевіч прапрацаваў з 1970 да 1987 года. Менавіта ў той перыяд ён і набыў аўтарытэт у прафесійным асяроддзі, стаў прызнаным дырыжорам.

Пры гэтым не перапынялася выкладчыцкая і даследчыцкая дзейнасць творцы. Так, узначальваючы цыркавы аркестр, ён выдаў дзве навуковыя працы (дапаможнікі для студэнтаў-музыкантаў), а ў 1981 годзе скончыў кансерваторскую аспірантуру, удасканаліўшы сваю дырыжорскую тэхніку. На базе ўсё той жа кансерваторыі з маладых навучэнцаў установы Фінбергам фарміруецца студэнцкі эстрадны аркестр. Многія з выканаўцаў пазней увойдуць у Дзяржаўны аркестр сімфанічнай і эстраднай музыкі БССР.

Уласна, калектыў пад такой назвай узнік 21 лютага 1987 года, акурат да саракагоддзя маэстра. З гэтага моманту пачынаецца новая старонка ў біяграфіі славутага творцы… Наваспечаны аркестр на чале з амбіцыйным дырыжорам адразу паставіў перад сабой глабальныя мэты: папулярызацыя беларускай народнай песні і нацыянальнага музычнага мастацтва ўвогуле, пошук і адкрыццё новых выканаўцаў ды арганізацыя фестываляў эстраднай і акадэмічнай музыкі. Ад вызначанага курсу ўдзельнікі заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь не адступаюць і сёння.

На працягу ўсяго існавання аркестр папулярызаваў нацыянальнае музычнае мастацтва. Так, па ініцыятыве Міхаіла Якаўлевіча было зладжана больш за 130 фестываляў эстраднай і акадэмічнай беларускай музыкі ў малых гарадах краіны. Гастрольны маршрут калектыву працягнуўся праз усе вобласці Беларусі. Сярод найбольш заўважных імпрэз — свята музыкі «Заслаўе», свята мастацтваў «Мірскі замак», фестываль «Музычныя краявіды Хойніцкай зямлі», фестываль мастацтваў імя народнага артыста Беларусі кампазітара М. Чуркіна «Мсціслаў», мастацкі праект «Гасцёўня Напалеона Орды» ў Іванаве.

Менавіта намаганнямі кіраўніка творчага калектыву, перайменаванага ў 2005 годзе ў Нацыянальны акадэмічны аркестр сімфанічнай і эстраднай музыкі Рэспублікі Беларусь, у культурную прастору нашай краіны вярнуліся імёны многіх беларускіх кампазітараў мінулых стагоддзяў. У рэпертуар аркестра ўвайшлі адноўленыя творы Міхаіла Ельскага, Мечыслава Карловіча, Яна Голанда, Восіпа Казлоўскага, Міхаіла Клеафаса Агінскага, Мацея і Антонія Радзівілаў, Напалеона Орды, Станіслава Манюшкі, а таксама некаторых іншых. Не апошнюю ролю ў іх аднаўленні сыграла паплечніца дырыжора па даследчыцкай дзейнасці мастацтвазнаўца Вольга Дадзіёмава.

Трэба сказаць, што кіраўнік аркестра ішоў да гэтага не адно дзесяцігоддзе і толькі ў 1993-м — тады, калі ўпершыню быў праведзены нацыянальны фестываль паэзіі і песні ў Маладзечне — яго мара паступова пачала ператварацца ў жыццё. Тут жа, у Маладзечне, адбылася прэзентацыя «Анталогіі беларускай паэзіі і песні», прэм'ера, вельмі чаканая самім укладальнікам. Больш як 30 твораў беларускіх паэтаў і кампазітараў XVI—XXI стст. прагучала тады са сцэны. Паказальным вынікам гэтай працы стала прысуджэнне ў 1996 годзе Міхаілу Фінбергу Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

Як знаны асветнік і адзін з найбольш актыўных папулярызатараў нацыянальнай музыкі, Фінберг пры ажыццяўленні ўсіх падобных ініцыятыў заўсёды з пашанай ставіўся да матэрыялу і пільна сачыў за тым, каб яго калектывам захоўваліся традыцыі нацыянальнай выканальніцкай школы. Адпаведнае стаўленне калектыў і яго кіраўнік выяўлялі падчас работы над такімі папулярнымі праектамі, як Нацыянальны конкурс маладых выканаўцаў беларускай песні, Міжнародны фестываль джазавай музыкі «Мінскі джаз», фестывалі «Спяваем з аркестрам» і «Шлягеры на ўсе часы».

Верагодна, аднак, у памяці большасці знакаміты дырыжор разам са сваімі паплечнікамі застанецца ўсё ж дзякуючы іншаму дасягненню. Па меркаванні многіх, адной з галоўных перамог Міхаіла Якаўлевіча, якой ён без перабольшання ўпісаў сябе ў гісторыю, стала дачыненне да арганізацыі Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». Нацыянальны акадэмічны аркестр сімфанічнай і эстраднай музыкі Рэспублікі Беларусь пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга праводзіў усе конкурсы выканаўцаў эстраднай песні на фестывалі з моманту яго заснавання.

Нельга не згадаць той факт, што беларускі аркестр дамогся вялікага прызнання і па-за межамі нашай краіны. На расійскім тэлебачанні доўгі час трансліраваліся папулярныя шоу «Песня года» і «Угадай мелодию» з удзелам калектыву. Дырыжор супрацоўнічаў таксама з многімі зоркамі расійскай эстрады (А. Пугачовай, Ф. Кіркоравым, Ю. Антонавым, І. Кабзонам і інш.). Запомніліся аўдыторыі і яркія выступленні ў канцэртнай зале «Расія», Крамлёўскім палацы. Да таго ж два гады музыканты працавалі на італьянскім тэлебачанні, выступалі ў Югаславіі, Польшчы, Літве…

Больш як паўстагоддзя плённай дырыжорскай і асветніцкай працы, нястрымны імпэт і невычарпальная энергія ў спалучэнні з прыроджаным талентам і тонкім адчуваннем прыгожага забяспечылі Міхаілу Якаўлевічу бессмяротную славу ў памяці нашчадкаў. Як пры жыцці маэстра, канцэрты, на якіх яму даводзілася дырыжыраваць, збіралі сапраўдныя аншлагі, так і на развітанне з ім у філармонію прыйшлі сотні людзей. Апошні, пасмяротны, трыумф майстра, народнага артыста Беларусі, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі, кавалера ордэна Францыска Скарыны, прайшоў пад гул апладысментаў.

Многія ўдзячныя прыхільнікі творчасці Міхаіла Якаўлевіча, яго сябры і знаёмыя, выхаванцы і калегі звяртаюцца ў рэдакцыю «ЛіМа», каб выказаць свае шчырыя спачуванні родным і блізкім музыканта, падзяліцца ўспамінамі… Калектыў газеты далучаецца да агульных спачуванняў і сумуе разам з усімі.

Мікіта ШЧАРБАКОЎ
Фота Кастуся Дробава

Змітрок МАРОЗАЎ

Маэстра

Калі з апошняга прычалу
цябе панеслі на пагост,
З нябёсаў музыка гучала
на сотні тысяч зорных вёрст.

Адплыў чысцюткі, як дзіцяці,
маэстра сонечны. Паэт…
І філармонія, як маці,
цябе праводзіла ў Сусвет.

Палон, які прынёс плён

Войны розныя бываюць. Пра адны вядома шмат, пра іншыя — менш. Пра некаторыя мала хто і чуў. Як, напрыклад, пра Хатнюю вайну. Не блытаць з аднайменным амерыканскім камедыйным фільмам, які ў арыгінале называецца «Вяртанне дамоў». Больш распаўсюджаная яе назва — «Грамадзянская вайна ў Вялікім Княстве Літоўскім 1696—1702 гадоў». Разгарнулася яна пасля смерці караля польскага і вялікага князя літоўскага Яна III Сабежскага. Сутыкнуліся Сапегі і іх апазіцыя ў складзе Радзівілаў, Вішнявецкіх, Пацаў і Агінскіх.

Спачатку Сапегі падтрымлівалі шведскага караля Карла XII. Пасля — яго стаўленіка Станіслава Ляшчынскага. Супраць Сапегаў і яго прыхільнікаў выступаў кароль польскі і курфюрст Саксоніі Аўгуст II. Саюзнікам быў расійскі імператар Пётр I. 29 жніўня 1702 года яны пачалі аблогу Быхава. На падмогу паспяшалася некалькі казацкіх палкоў. Падышло і войска генерала артылерыі Вялікага Княства Літоўскага Крыштафа Казіміра Сяніцкага.

Ва ўзяцці горада — найперш яго заслуга, хоць і адбылося гэта толькі 10 кастрычніка. Крыштаф Казімір стаў губернатарам Быхава і адміністратарам Быхаўскага графства. Праз год — генерал-маёр ВКЛ. Брат Людвік у аблозе не ўдзельнічаў, але ўзрослы аўтарытэт Крыштофа Казіміра паўплываў на яго лёс. Спачатку стаў адміністратарам Магілёўскай эканоміі, пасля — віцэ-губернатарам Быхава. З'яўляўся і падстолім Вялікага Княства Літоўскага. Найбольш важная пасада, якую займаў, — рэгіментар: так называлі часовага намесніка гетмана.

Аднак неўзабаве Сяніцкія вырашылі, што саюз з Сапегамі і Карлам II усё ж дасць ім больш. Канешне, разумелі што ранейшыя саюзнікі здраду ім не дараюць. А, помсцячы, першы ўдар нанясуць па Быхаву. Так і адбылося, і скончылася іх поўным разгромам. Братам скавалі рукі і ногі, пасадзілі ў параконны паланкін — спецыяльны сродак для перамяшчэння ў Сібір. Прыставілі канвой…

Два гады яны знаходзіліся ў адным з маскоўскіх манастыроў. Пасля пачалася дарога ў Сібір. Адпраўлялі кожнага паасобку. Пакідаючы ў 1709 годзе Маскву, Людвік не ведаў, што яны больш ніколі не пабачацца. Як і не здагадваўся, што Крыштаф Казімір пражыве яшчэ ўсяго тры гады. Адно ведаў: Сібір вялікая. Не ўсе мясціны даследаваны. То хоць свет пабачыш. Ды што Сібір... Толькі праехалі Перм, як са здзіўленнем даведаўся, наколькі побыт, звычкі, заняткі людзей непадобныя на тыя, што ў яго на радзіме..

Успаміны пісаць узяўся не адразу. Калі — невядома. Але ў 1754 годзе яны выйшлі асобнай кнігай у Вільні. Назва яе нават у кароткім варыянце занадта складаная: «Дакумент асаблівай міласэрнасці божай, што цудоўна пераводзіць з кальвінісцкай секты пэўнага слугу і паклонніка божага ў Хрыстовы касцёл». Здзіўляцца не трэба. За пяро ўзяўся не літаратар. Ды, з'яўляючыся чалавекам назіральным, дапытлівым, даволі праўдзіва расказаў аб жыцці народаў Сібіры тады, калі яна толькі асвойвалася. Параўноўваючы гэта з сённяшнімі звесткамі, адчуваеш змены, якія там адбыліся.

Стараўся болей даведацца, запомніць. Гэтае жаданне павялічылася, калі мінуў «зямлю пермскую», «зямлю зыранскую». Апынуўся там, дзе жылі мансі. Дагэтуль і не здагадваўся, што апратку можна шыць са старанна апрацаванай скуры рыбы, лоўля якой была іх любімым заняткам. А вадзе яны пакланяліся як Богу.

Далей яго шлях пралягаў праз Верхатур'е, Табольск. Да самага Якуцка, дзе жыў да 1722 года. Пакуль не атрымаў амністыю. Дзе б ні знаходзіўся, хацеў як мага больш запомніць. Каб пасля вяртання на радзіму расказаць пра гэта тым, хто не можа пабываць у далёкіх краях. Што вернецца, не сумняваўся. Ад ссыльных, якія трапілі ў Якуцк раней, даведаўся: многія дажываюць да вызвалення. Але знаходжанне ў суровых умовах бясследна не прайшло. Па некаторых звестках вярнуўся псіхічна хворы. Аднак, відаць, вылечыўся. У 1733 годзе быў сярод 12 тысяч тых, хто каралём польскім выбраў Станіслава Ляшчынскага.

Фота з сайта krskstate.ru

Ненецкі паляўнічы.

Успаміны пісаць узяўся не адразу. Калі — невядома. Але ў 1754 годзе яны выйшлі асобнай кнігай у Вільні. Назва яе нават у кароткім варыянце занадта складаная: «Дакумент асаблівай міласэрнасці божай, што цудоўна пераводзіць з кальвінісцкай секты пэўнага слугу і паклонніка божага ў Хрыстовы касцёл». Здзіўляцца не трэба. За пяро ўзяўся не літаратар. Ды, з'яўляючыся чалавекам назіральным, дапытлівым, даволі праўдзіва расказаў аб жыцці народаў Сібіры тады, калі яна толькі асвойвалася. Параўноўваючы гэта з сённяшнімі звесткамі, адчуваеш змены, якія там адбыліся.

Людвік Сяніцкі стаяў каля вытокаў падарожнага жанру ў беларускай літаратуры. У асноўным ішоў ад асабістых назіранняў і ўражанняў, што павялічвае праўдзівасць расказанага. Прынамсі, цікавыя яго назіранні за жыццём ненцаў. Тады іх часам называлі і самаедамі. Прызнаваўся, што «бачыў толькі праездам па Абі». Яны «носяць у якасці апраткі аленевыя скуры ніяк не сшытыя, а толькі выраблены, з пярэднімі нагамі, у якія засоўваюць рукі». Каб было цяплей, звычайна апраналі дзве скуры. Адну — шэрсцю да цела, другую да першай, шэрсцю наверх.

Меў на ўвазе нацыянальную апратку маліцу, якая ў ненцаў карысталася вялікай папулярнасцю. Праўда, чамусьці не заўважыў, што яны насілі скураныя штаны, абутак з меху. Ёсць і тое, што ў той час было ў навіну. Вельмі здзівіўся: сабак туземцы «як коней запрагаюць у нарты». Нарты «пяць аршынаў у даўжыню і толькі тры чвэрткі аршына ў шырыню». Клалі на іх да сарака пудоў грузу.

Памыляўся не толькі ён, але і іншыя, называючы ненцаў «самаедамі». Меркавалі, што ядуць толькі сырое мяса. Але ж яны любяць і варанае, і смажанае. Пра эвенкаў расказаў падрабязней: «Потым прывезлі нас у Енісейск, адкуль зямля тунгуская пачынаецца; мова ў іх іншая, непадобная на іншыя народы: ходзяць яны ў незвычайнай апратцы з выраблених звярыных скур, сшытых па іх спосабу замест нітак скручанымі аленевымі жыламі. Аленевую шэрсць, пафарбаваную ў чырвоны колер вакол апраткі да падолу замест бахрамы, хвасты ззаду выразанымі пакідаюць, на галовах носяць ззаду адну заплеценую касу». Сведчыў, што гэта «людзі вялікага росту; у глухіх лясах пастаянна ловяць і страляюць розных звяроў, здабываюць лясного звера дзеля апраткі, харчу і ясаку цару». Эвенкі, як і іншыя народы Сібіры, плацілі ясак.

Пісаў Людвік Сяніцкі па прынцыпе «ўбачыў, запомніў, расказаў». Для яго сучаснікаў — гэта падарожжа ў далёкія землі, да невядомых народаў. Для прыкладу: тагачаснаму чытачу было цікава, што эвенкі трымалі хатніх аленяў. На самцах ездзілі, а самак даілі як кароў. Убачанае параўноўваў з тым, што было звыклым на яго радзіме. Хоць бы ў гэтым выпадку: «Тунгусы пастаянных дамоў не маюць, увесь час з месца на месца пераязджаюць, каб карміць аленяў; на тых жа аленях перавозяць свае юрты, па-польску палаткі».

Эвенкі сапраўды карысталіся лёгкім конусападобным шалашом. Ён у іх з'яўляўся паходным жытлом. Юрты ж былі характэрнымі для тых народаў Цэнтральнай Азіі, якія вялі вандроўны лад жыцця. На такую недакладнасць ніхто не мог звярнуць увагі. Іншых звестак, апроч пададзеных Людвікам Сяніцкім, яшчэ не было. У напісаным ім вабіла сама экзотыка. Не паўднёвая, пра якую пісалася больш. А паўночная. Сібірская, адначасова і сіберная, віхурная. Хоць бы такая. Эвенкі сваё жытло ніколі не зачынялі. Маразы ж у тамашніх мясцінах суровыя. А яны «зімой сядзяць каля свайго агменю аголеныя». Не зважаюць, што ўваход вакол снег засыпаў.

А дзе яшчэ людзі моляцца такому незвычайнаму богу?! «Бог у іх — чорны мядзведзь, і калі ім надараецца калі-небудзь забіць мядзведзя, тады над забітым скачуць, крычаць, просяць прабачэння, што зрабілі гэта не па сваёй волі, а па загадзе, таму што і ружжо рускія зрабілі, порах рускія далі, загадаўшы, каб абавязкова мядзведзяў стралялі, знаходзячыся пад іх уладаю павінны выконваць іх загады...»

Пакланяліся эвенкі, праўда, не чорнаму мядзведзю, а бураму. Толькі такой бяды, якая ў яго поўсць. Да забітага звярталіся пачціва: «Ты на нас не сярдуй». Калі шанцавала ў паляванні, рабілі «памост з трох жэрдак і развешвалі на ім ласіныя ці аленевыя скуры ў гонар мядзведзя, дзякуючы яму за ўдачу».

Што мядзведзь у эвенкаў з'яўляўся бажаством, Людвік Сяніцкі засведчыў першым. Напаткаў на сваім шляху і буратаў. Тады еўрапейцы называлі іх «братамі» ці «брацкім народам»: «З Енісейска павезлі мяне ў Ейск; пражываючы там на працягу некалькіх тыдняў, я бачыў іншы народ, які называецца браты». Сцвярджаў, што яны «валодаюць нябачнымі статкамі коней, авечак». Багатыя бураты сапраўды гадавалі не адну сотню коней, авечак, кароў і коз. У некаторых былі нават тысячы. Але ў беднякоў у лепшым выпадку ўсяго некалькі кароў ці авечак. А коней трымалі далёка не ўсе.

Самыя вычарпальныя звесткі прывёў пра якутаў. Столькі ж гадоў правёў сярод іх! Гэты «народ адрозніваецца ад усіх тамашніх народаў і мовай, і апраткай, мову мае асаблівую, апратку падобную шведскай, толькі ўся са звярыных скур і аблягае цела, ззаду разрэзы». Адзенне якутаў невыпадкова параўнаў са шведскім: «Аб гэтых якутах кажуць, быццам некалі былі родам са Швецыі і, не жадаючы пераносіць цяжкасці, селі з жонкамі і дзецьмі на караблі, пусціліся ў мора і былі ветрам прынесены ў Якуцк, высадзіўшыся, разграміўшы і прагнаўшы з усёй якуцкай округі тунгусаў, якія валодалі гэтай зямлёй, там пасяліліся».

Якуты — сапраўды перасяленцы. Але ў басейн ракі Лены яны трапілі з поўдня Сібіры. Таму цікава, што цяпер сярод даследчыкаў ёсць тыя, хто прытрымліваецца шведскай версіі. Аднак чытаючы, што ў рэгіёне водзяцца зубры, пантэры і тыгры, нельга не рассмяяцца. Некалі, бадай, і былі такія фантазёры, якія прымусілі Людвіка Сяніцкага паверыць гэтаму. Хоць хутчэй за ўсё яго падвяла памяць. Мог атрыманыя з іншых крыніц звесткі «прыпісаць» да сваіх якуцкіх уражанняў.

Здзівіла яго і багацце розных ягад. Якуты ахвотна збіралі «чырвоныя і чорныя парэчкі, чарніцы і п'яніку, брусніцы». Прадавалі іх рускім. Назапашвалі так шмат, што напаўнялі ягадамі некалькі вазоў. Сярод ягад вылучалася марошка. На працягу кароткага, але спякотнага лета яна паспявала ледзь не каля самага ўзбярэжжа "Ледавітага Мора", цяперашні Паўночны Ледавіты акіян. Паўсюдна расла на імхах. Нагадвала маліну, але куды большага памеру. Была цвярдзейшая і такая жоўтая, як воск.

Дзе-дзе, а тут ні кроплі маны. Асабіста ведаю, як шмат ягад у Якуціі. Давялося быць там. Праўда, бліжэй да тых мясцін, дзе яна мяжуе з Амурскай вобласцю.

У кнізе ёсць звесткі і з жыцця некаторых іншых народаў. Але гэта не ўражанні самога апавядальніка. Людвік Сяніцкі выкарыстаў сведчанні іх прадстаўнікоў, з якімі сустракаўся ў Якуцку. Яны прыязджалі па гандлёвых справах. Суправаджалі падарожнікаў. Нават стаў першым у Вялікім Княстве Літоўскім, хто падаў звесткі пра Японію з вуснаў яе жыхароў.

Тады ніхто не мог трапіць у гэтую краіну. Для іншаземцаў яна была закрытай. Знаёмства з японцамі ў Людвіка Сяніцкага адбылося ў Якуцку. Судна, на якім яны плылі з таварамі ў Кітай, пацярпела караблекрушэнне. Некалькі чалавек уратаваліся, дабраліся да Камчаткі. Іх паланілі камчадалы і прывезлі ў Якуцк. Японцы і распавялі яму аб непаўторнасці і багацці сваёй краіны. Звесткі нешматлікія, але яны цікавыя, як гістарычны факт.

Як і ўсё жыццё Людвіка Сяніцкага, якога не стала 24 студзеня 1757 года. Няма сумнення ў тым, што ён — адважны абаронца Айчыны. Аднак ухвалы заслугоўвае і як пісьменнік-мемуарыст, пісьменнік-дакументаліст. Як гэта ні парадаксальна, палон прынёс яму добры плён.

Алесь МАРЦІНОВІЧ

Камп'ютар эпохі… Рыбанькі

Хто такі Рыбанька, знаўцы нацыянальнай гісторыі ведаюць добра. Вядома ж, гэта адзін з прадстаўнікоў знакамітага роду Радзівілаў, у якім, дарэчы, распаўсюджаным было імя Міхаіл. Гэтага звалі Міхаіл Казімір. Такое падвойнае імя было і яшчэ ў аднаго Радзівіла. Але, дзякуючы ўдакладненню Рыбанька, іх і не блытаюць. А Рыбанькам ён стаў таму, што да суразмоўцаў, асабліва да прыгожай палавіны чалавецтва, звяртаўся гэтакім ласкавым словам.

У 1726 годзе Міхаіл Казімір Рыбанька ўзяўся за аднаўленне Нясвіжскага замка, зруйнаванага шведамі ў 1706-м. Гэты горад, які стаў яго рэзідэнцыяй, набыў свой непаўторны выгляд. Яго заслуга ў тым, што ў Нясвіжы адкрыліся друкарня, бібліятэка, карцінная галерэя. Без яго намаганняў не з'явіліся б першыя ў Вялікім Княстве Літоўскім мануфактуры. Найбольш вядомыя Навасвержанская фаянсавая і Слуцкая персіярня, у якой ткалі знакамітыя паясы.

Можна гаварыць і пра іншыя яго добрыя справы. Толькі пра адну чамусьці замоўчваюць. Без Рыбанькі на тэрыторыі Беларусі наўрад ці з'явіўся б першы камп'ютар. Неверагодна? Тым не менш гэта так. Патрабуецца толькі адно невялікае, але важнае ўдакладненне. Канешне, рабіў яго не сам ён. Аднак менавіта пры ім у Нясвіжы з'явіўся той, хто ажыццявіў такую важную справу.

Увогуле, ён любіў запрашаць у свой горад прадстаўнікоў розных прафесій. Безумоўна, надаваў увагу не нейкім перакаці-поле, а спецыялістам вышэйшага класа. З'явіліся і людзі з творчымі задаткамі: мастакі, гравёры, збройнікі. На яго прапанову працаваць у Нясвіжы адгукнуўся і майстар па гадзінніках, механік нехта Еўна Якабсон.

Нехта — прамоўлена невыпадкова. Хто ён і адкуль — невядома. Адзінокім быў ці сямейным — таксама ніякай пэўнасці. Магчыма, паходзіў з мястэчка Гнезна, што непадалёку ад Познані. Ускосна пра гэта сведчыць залаты кубак, што знаходзіўся ў мясцовым касцёле. Гранулёваны надпіс на ім сведчыў, што яго вырабіў Еўна Якабсон. Пазначаны быў і год — 1786.

Але ж выраб такога кубка — справа ювелірная. Еўна ж Якабсон, які працаваў у Рыбанькі, як ужо было сказана, майстар па гадзінніках, механік. Як быццам навідавоку сумяшчэнне несумяшчальнага. Што ў нясвіжскага Якабсона быў аднафамілец, бы яшчэ каб у абодвух супадала не толькі прозвішча, але і імя — малаверагодна. Значыць, гнезненскі Еўна Якабсон і ёсць той самы Еўна Якабсон з Нясвіжа. Магчыма, пасля смерці свайго гаспадара 15 мая 1726 года ён не адразу развітаўся з гэтым горадам, а пасля перабраўся бліжэй да Познані. Магло быць і так, там нарадзіўся. А можа працаваў перад тым, як адгукнуўся на запрашэнне Рыбанькі. Быў майстар на ўсе рукі, таму і арыгінальны кубак стварыў. Аднак найбольш аб тым вялікім таленце, якім валодаў, сведчыць камп'ютар, выраблены ім.

Убачыць гэты цуд з цудаў можна ў калекцыі навуковых інструментаў Музея імя М. В. Ламаносава ў расійскім горадзе Санкт-Пецярбургу. Адзін з надпісаў з нямецкіх і лацінскіх слоў на вечку ўказвае аўтарства і месца яго стварэння. У перакладзе на беларускую мову гэта гучыць так: «Машына вынайдзена і выраблена яўрэем Еўнам Якабсонам, гадзіннікавым майстрам і механікам у горадзе Нясвіжы ў Літве, Мінскае ваяводства».

Гэты надпіс дазваляе даследчыкам прыкладна вызначыць, калі тварэнне Еўны Якабсона з'явілася. Усходняя частка Мінскага ваяводства адышла да Расійскай імперыі ў 1772 годзе. Астатняя, у тым ліку і Нясвіж, у 1793-м і стала часткай Мінскай губерні. Відавочна, што вынаходнік не мог завяршыць сваю работу пасля другой з названых дат. Інакш не зрабіў бы ўдакладненне «Мінскае ваяводства». Даследчыкі сыходзяцца на тым, што адбылося гэта не пазней 1770 года. Адкуль падобная выснова?

Меркаваць так дазваляюць некаторыя элементы якабсонаўскага камп'ютара, характэрныя менавіта згаданаму перыяду. Гэта формы асобных дэталей, іх апрацоўка і аддзелка. Малюнкі накладных дэкаратыўных разетак, іх формы. Канешне, нічога падобнага ў сучасных камп'ютарах няма. Але ж не трэба забываць, што гэта камп'ютар XVIII стагоддзя. Асобнік яго, што трапіў у санкт-пецярбургскі музей, адзіны, які захаваўся. Яго ў 1812 годзе, разрабаваўшы нясвіжскую скарбніцу, забралі з сабой казакі атамана Мацвея Платава. Яшчэ пашчасціла, што не прапаў беззваротна.

Ён нагадвае сабой латуневую скрынку памерамі 34,2 × 21,8 × 3,4 см на чатырох вытачаных ножках дыяметрам 1,6 і вышынёй 1 см. Накрыўка аздоблена багатым арнаментам, а надпіс па-нямецку і па-польску сведчыць, што гэта «механічная вылічальная машына». Яшчэ адзін надпіс, толькі нямецкамоўны, гаворыць аб яе прызначэнні: «Дзеля задач складання, адымання, множання, дзялення ад аднаго да тысячы мільёнаў, і астатак ад дзялення тут можна падзяліць на дробы».

Такой кампактнасці свайго камп'ютара Еўна Якабсон дасягнуў за кошт удала прадуманага размяшчэння вузлоў на розных узроўнях. Паменшыць памеры яе дазволіла і тое, што механізмы зманціраваны на вечку каробкі з унутранага боку. А на вонкавым баку знаходзяцца ўсе ланцужкі, якімі ажыццяўляюцца вылічальныя аперацыі, і ўсе шкалы.



Фота з сайта kunstkamera.ru

Колькасць механізмаў зменшылася дзякуючы таму, што асобныя з іх нясуць двайную нагрузку. Так множанне выконвалася праз паўторнае складанне. Дзяленне — як паслядоўнае адыманне з фіксацыяй адыманняў. Мелася і асабліва прыстасаванне, дзякуючы якому аўтаматычна падсумоўвалася колькасць праведзеных адыманняў.

Аднак Еўна Якабсон усё ж быў не першы, хто пастараўся аблегчыць выкананне розных арыфметычных дзеянняў. Першынство ў стварэнні арыфмометра належыць нямецкаму вучонаму, астраному, матэматыку і ўсходазнаўцу Вільгельму Шыкарду. Ён прыдумаў «гадзіннік, які лічыць» — распаўсюджана і такая назва — у 1623 годзе. А ўвогуле вытокі камп'ютара недзе прыкладна ў другой паловы II стагоддзя да н. э. Тады быў створаны так званы антыкітэрскі механізм. Ён выкарыстоўваўся для разліку руху нябесных цел. І нават дазваляў даведвацца пра даты 42 астранамічных падзей.

Ды выхадзец з Нясвіжа пра гэта не ведаў. А калі б і ведаў, значнасць здзейсненага ім ад гэтага не змяншаецца. Камп'ютар Еўны Якабсона з XVIII стагоддзя — першая лічыльная машына не толькі на тэрыторыі Беларусі, але і ў суседніх славянскіх краін. У музеях Расіі гэта адзіны помнік вылічальнай тэхнікі XVIII стагоддзя.

Барыс ГРАНОЎСКІ

Мода ад Чорнага Тыгра

Як лепш сустрэць чароўныя зімовыя святы? Дзе і з кім іх адзначаць? Якія стравы прыгатаваць? І, у рэшце рэшт, якое адзенне выбраць для сустрэчы 2022 года? Якраз на апошняе з многіх хвалюючых пытанняў дапаможа знайсці адказ цыкл лекцый «Сакрэты стылю», які праходзіць у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.

Ідэямі навагоднята ператварэння дзеліцца ўжо знаёмая чытачам і супрацоўнікам бібліятэкі імідж-стыліст Кацярына Макар, аўтар цыкла бясплатных публічных лекцый «Сакрэты стылю», якія праходзілі з красавіка да чэрвеня 2021 года.

На працягу снежня па серадах усім ахвотным зноў адкрываюцца сакрэты моднага гардэроба. Ужо прайшлі заняткі пад назвай «Пазбаўляемся ад старога — упускаем у жыццё новае». Тэмы наступных лекцый: «У чым лепей сустракаць год Чорнага Тыгра?», «Карта жаданняў. Новы імідж — новае жыццё», «Сезон "Вясна — лета 2022": модныя тэндэнцыі».

Сустрэчы праходзяць у зале дакументаў па мастацтве. Пачатак заняткаў у 15:00, уваход вольны (пры наяўнасці чытацкага білета або пропуску сацыякультурнага цэнтра).

Яўгенія ШЫЦЬКА

Без падрабязнасцей, але навыварат

Мастацкая галерэя «Вільнюс» бібліятэкі № 18 прадстаўляе выстаўку жывапісу Ксеніі Місан-Быстровай «Навыварат». У экспазіцыі, якую, па вызначэнні арганізатараў, можна назваць шчырай размовай мастака з гледачом, дэманструецца каля 30 работ.

Творца скончыла Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў: вучылася на факультэце дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, дзе выкладалі вядомыя майстры, у ліку якіх — Уладзімір Рынкевіч. Ксенія Місан-Быстрова працуе ў кніжнай графіцы, дэкаратарам, стварае пано.

— Мэта выстаўкі — не спроба кагосьці здзівіць ці шакаваць. Хаця можна было б. На пэўным этапе творчасці ўвесь час хацелася цяпла і пяшчоты, а хто, як не самыя родныя і любімыя, могуць падарыць такія адчуванні. У кожнага чалавека ёсць дарагія і каштоўныя тайнікі, і часам гэтым жадаеш падзяліцца з кімсьці яшчэ. Без падрабязнасцей, але навыварат, — расказвае пра сваю выстаўку Ксенія Місан-Быстрова.

Мастачка актыўна ўдзельнічае ў гарадскіх і рэспубліканскіх выстаўках. У ліку праектаў апошняга часу — «Арт-Мінск», «Мроі-крылы» (Гродна, Віцебск), «Дрэвы і вобразы» (Мінск). Уваход на выстаўку «Навыварат», якая будзе працаваць у мастацкай галерэі «Вільнюс» да 16 студзеня, вольны.

Яўгенія ШЫЦЬКА

млын навін

* * *

Вынікі міжнароднага конкурсу ёлачных цацак «Казка Каляд» падвялі ў Залатой зале Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Нясвіж». Удзельнікі з Беларусі, Расіі, Канады, ЗША прадставілі вязаныя, пашытыя, фетравыя і драўляныя ўпрыгажэнні. У фінал трапілі 20 арыгінальных работ. Любавацца ёлкай, упрыгожанай гэтымі цацкамі, наведвальнікі замка змогуць да 22 студзеня. Пераможцам прызнана работа «Чорная Пані Нясвіжа» Таццяны Герасіменкі з Мінска. Цацка сугучная месцу, дзе яна выстаўляецца і спалучае адразу некалькі тэхнік. Другое месца заняла Святлана Грышына (Расія) з работай «Рыбанька», таксама навеянай нясвіжскімі матывамі.

Віталь ЖУРАЎСКІ

* * *

У гісторыка-культурным музеі-запаведніку «Заслаўе» знаходзіцца найбольшая калекцыя маляванак у Беларусі. Дыяментамі сярод іх з'яўляюцца работы Язэпа Драздовіча і Алены Кіш. Шэраг арыгінальных дываноў з фондаў музея-запаведніка прадстаўлены на выстаўцы, якая дае магчымасць разгадаць загадку беларускай маляванкі. Часцей за ўсё яна ўяўляла сабой пакрыты спецыяльнай асновай дыван, размаляваны фарбамі. На вырабах можна пабачыць замкі, палацы, казачных персанажаў, закаханыя пары, звяроў... Такі дыван упрыгожваў інтэр'ер сялянскай хаты, выступаў у якасці яскравай «кропелькі» мастацтва, хай сабе і даволі простага, але самабытнага і адметнага. Маляванкі давалі магчымасць адарвацца ад клопатаў паўсядзённасці, зірнуўшы на цуды.

Міра ІЎКОВІЧ

* * *

Год народнага адзінства — час згуртавання беларускага грамадзтва. Нядаўна супрацоўнікі аддзела абслугоўвання і інфармацыі Астравецкай раённай бібліятэкі наведалі гімназію № 1 і правялі гістарычную замалёўку «Беларусь учора, сёння, заўтра». У імпрэзе бралі ўдзел вучні 9 класаў, якія толькі ўступаюць у дарослае жыццё. Творы айчынных аўтараў, конкурсы, апытанні дапамаглі лепш спазнаць сваю краіну, яе традыцыі і гісторыю. Вучні ўзнаўлялі прыказкі, перакладалі словы з рускай на родную мову, прыгадвалі славутых беларускіх дзеячаў, адгадвалі загадкі. Моладзь актыўна ўключалася ў абмеркаванне, юнакі і дзяўчаты адказвалі на пытанні, спрачаліся. Такія жывыя зносіны дапамагаюць з'яднацца, пасябраваць, даведацца шмат новай і цікавай інфармацыі, праз традыцыйныя і інавацыйныя формы лепш спазнаць гісторыю і звычаі свайго народа. Усё гэта дапамагло юным грамадзянам яшчэ раз задумацца над важнасцю адзінства ў сям'і, класе, школе і роднай краіне.

* * *

Чарговае пасяджэнне аматарскага аб'яднання «Жывіца» адбылося у Альхоўскай сельскай бібліятэцы. Гэтым разам размова ішла пра птушак, якія застаюцца зімаваць. Бібліятэкар правяла віктарыну-акцыю «Пакарміце птушак» і падрыхтавала цікавыя звесткі пра крылатых насельнікаў. Малодшыя школьнікі паспрабавалі намаляваць птушак, а пасля адказаць на пытанні віктарыны. Затым удзельнікі аб'яднання падарожнічалі па лесе, паспрабавалі адшукаць птушак. Былі падрыхтаваны кармушкі, якія дзеці прымацавалі на дрэвах. Мерапрыемства выклікала шмат прыемных эмоцый, дазволіла ўзбагаціць свае веды новай і цікавай інфармацыяй.

Вольга ЗАЯНЧКОЎСКАЯ

* * *

Выстаўка творчых работ людзей з інваліднасцю «Прыгажосць маімі рукамі», якая ладзілася ў філіяле «Лідская гарадская бібліятэка № 4» Лідскай раённай бібліятэкі імя Янкі Купалы, — яшчэ адзін доказ, што стэрэатыпы існуюць для таго, каб іх разбураць. Сваё майстэрства прадэманстравалі прадстаўнікі аддзялення дзённага знаходжання для інвалідаў раённага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва і члены Беларускага таварыства інвалідаў па зроку. Былі паказаны вырабы з дрэва (шкатулкі, падсвечнікі, сурвэтніцы), з гліны (гаршкі, вазы), цацкі. Ладзіўся і майстар-клас па вырабе «Каляднай зоркі» ў тэхніцы кусудама. Выстаўка дала магчымасць жыхарам і гасцям Ліды ўбачыць, як людзі з абмежаванымі магчымасцямі праяўляюць сябе ў дэкаратыўна-прыкладной творчасці.

Кацярына САНДАКОВА

* * *

Да Міжнароднага дня інвалідаў бярэзінскія бібліятэкары прапанавалі маладым людзям з фізічнымі абмежаваннямі сеанс смехатэрапіі «Гумар пад вясёлым парасонам». Падсілкавацца пазітыўным зарадам пацыентам дапамагалі гумарэскі, інтэрмедыі, маналогі, насценныя карыкатуры і арыгінальныя рэквізіты. Клоўн шчодра раздаваў вітамін-смехатрын, самым вясёлым — прызы, а яшчэ прапанаваў хвілінку гумарыстычнай фіззарадкі і фота пад вясёлым парасонам. 45 хвілін гумару і смехатэрапіі паспрыялі добраму настрою ўдзельнікаў імпрэзы.

Тамара КРУТАЛЕВІЧ

Простыя рэчы

Стварацъ жыццё мастацтвам

Побач з намі безліч таленавітых і самаадданых жанчын. Адна з іх — Лілія Кімса, якая зачароўвае сваім кругаглядам, мяккасцю, тактоўнасцю.

Лілія Кімса.

Яшчэ ў дзяцінстве ў Ліліі праявіўся талент да выяўленчага мастацтва. Тады дзяўчынка малявала ўсё, што траплялася на вочы: прыроду, сяброў, свой пакой. Пасля да малявання далучылася яшчэ адно захапленне — лепка. Безліч работ упрыгожвала пакой Ліліі, але яна заўжды шукала штосьці цікавае, асвойвала новыя тэхнікі.

Пасля заканчэння школы дзяўчына дакладна ведала, што звяжа сваё жыццё з выяўленчым мастацтвам. Марам таленавітай зямлячкі было суджана спраўдзіцца. Цяпер яна — загадчык аддзела рамёстваў і традыцыйнай культуры Астравецкага раённага цэнтра культуры і народнай творчасці. Шлях да гэтай пасады быў напоўнены творчасцю, перамогамі, новым досведам. Зараз складана знайсці той від дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, у якім яшчэ не працавала Лілія.

З 18 гадоў займаецца яна роспісам па шкле, на прафесійным узроўні распісвае кандытарскія вырабы, захапляецца цукровай фларыстыкай, а некалькі гадоў таму асвоіла тэхніку анатамічнай лепкі. Вышыўка, вязанне мяккіх цацак, адзення, роспіс сцен і тканіны, вырабы з палімернай гліны і халоднага фарфору. Прадаўжаць можна бясконца... Таленавіты чалавек таленавіты ва ўсім — гэты афарызм цудоўна суадносіцца з нашай зямлячкай.

Як сапраўдная жанчына, Лілія вельмі любіць упрыгажэнні. Аднак аддае перавагу не ювелірным вырабам, а ўласным работам, якія здзіўляюць з першага погляду: завушніцы і пярсцёнкі з элементамі шкла, вырабы з бісеру.

Прыемна і тое, што старэйшы сын Ліліі пераняў талент матулі. Яго малюнак заняў прызавое месца ў конкурсе, які праходзіў у ЗША.

Талент і сканцэнтраванасць на занятку — вось галоўныя элементы поспеху цудоўнага майстра. «Жыццё даецца, каб жыццё тварыць!» — сцвярджае Анатоль Вярцінскі. Гэтым жа прынцыпам кіруецца і Лілія Тадэвушаўна, якая кожны дзень дорыць прыгажосць гэтаму свету.

Калаж Святланы Таргонскай.

Вольга ЗАЯНЧКОЎСКАЯ, фота аўтара

зваротная сувязь

Пачуем вечнае ў часовым

Праграма «Літаратурная анталогія» на канале «Культура» Беларускага радыё прапануе працяг рамана Фёдара Дастаеўскага «Злачынства і пакаранне» (да 200-годдзя з дня нараджэння класіка рускай літаратуры) у выкананні Алега Вінярскага. У «Радыёбібліятэцы» гучыць аповесць Людмілы Рублеўскай «Пярсцёнак апошняга імператара», чытае Маргарыта Захарыя. Апавяданні Сафрона Данілава, а таксама Ганада Чарказяна ў перакладзе Уладзіміра Марука чакаюць слухачоў у праекце «Літаратурныя гісторыі» ў вячэрнім эфіры выхадных. Аматарам паэзіі праграма «Прачулым радком» гэтым разам прапануе вершы Міхася Башлакова.

Змест праграмы «Радыётэатр плюс» у выхадныя складуць дзве часткі радыёверсіі спектакля Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы «Смех лангусты» па аднайменнай п'есе Джона Марэла.

Юным прыхільнікам мастацкага вяшчання канал «Культура» прапануе ў суботу і нядзелю праект «Дзіцячы радыётэатр» — пастаноўку «Чароўнае крэсіва» паводле Ханса Крысціяна Андэрсена. Чытанні ладзяцца па буднях у межах праекта «Дасціпныя. Нястомныя. Кемлівыя». У гэтыя дні гучыць твор Уладзіміра Ліпскага «Закаханы трэцякласнік». «Вячэрняя казка» для маленькіх — штовечар у 21.00.

Публіцыстычны суботні праект «Кнігарня» пазнаёміць з літаратурнымі падзеямі і навінкамі беларускіх выдавецтваў, а таксама са зместам свежага нумара штотыднёвіка «ЛіМ».

У радыёверсіі тэлеперадачы Навума Гальпяровіча «Суразмоўцы», што гучыць у нядзелю і сераду, — гутарка з паэтэсай з Магілёва Алёнай Беланожкай.

У нядзелю — праект пісьменніка Навума Гальпяровіча «Сюжэт для вечнасці», у якім праз аўтарскую паэзію і прозу апавядаецца пра станаўленне творчай асобы.

У праграме магчымы змены. Расклад перадач канала «Культура» даступны на сайце *www.radio-kultura.by* і ў сацыяльных сетках.

Мінскае гарадское аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі запрашае:

22 снежня — у Цэнтральную навуковую бібліятэку імя Якуба Коласа НАН Беларусі на прэзентацыю рамана-эпапеі Мухтара Аўэзава «Шлях Абая» ў перакладзе на беларускую мову (11.00).

22 снежня — у літаратурны клуб «Шчырасць» пры публічнай бібліятэцы № 22 (вул. Яна Чачота, 23) на творчую сустрэчу з паэтэсай і бардам Таццянай Жылінскай (16.00).

23 снежня — на прэзентацыю зборніка вершаў Кацярыны Стройлавай «Навстрэчу Любви», якая адбудзецца ў Інстытуце тэалогіі (пр. Незалежнасці, 24, аўдыторыя 307) (15.45).

ЛіМ каляндар

18 снежня — 110 гадоў з дня нараджэння Алеся Есакова (1911—1985), крытыка, тэатразнаўца.

19 снежня — 125 гадоў з дня нараджэння Мікалая Сіманькова (1896—1983), майстра-ганчара.

19 снежня — 115 гадоў з дня нараджэння Вольгі Бембель-Дзядок (1906—1974), скульптара.

19 снежня — 115 гадоў з дня нараджэння Мікалая Клауса (1906—2001), дырыжора, піяніста, кампазітара. Жыў у Расіі.

19 снежня — 100 гадоў з дня нараджэння Мікалая Палянкова (1921—2005), жывапісца.

19 снежня — 80 гадоў з дня нараджэння (1941) Азата Тарасяна, скульптара.

19 снежня — 70 гадоў з дня нараджэння Мікалая Образава (1951—2014), мастака-акварэліста.

20 снежня — 110 гадоў з дня нараджэння Аляксандра Амітона (1911—1969), расійскага і беларускага скрыпача, педагога, заслужанага артыста БССР.

21 снежня — 225 гадоў з дня нараджэння Тамаша Зана (1796—1855), паэта, удзельніка рэвалюцыйнага руху.

21 снежня — 100 гадоў з дня нараджэння Івана Пешкура (1921—1980), мастака-сцэнографа, жывапісца.

23 снежня — 70 гадоў з дня нараджэння Алы Непачаловіч (1951—2021), мастака дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

24 снежня — 60-годдзе святкуе Аляксандр Крамко, музыкант, выканаўца на народных інструментах, дырыжор, заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь.

Калектыў Брэсцкага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі выказвае глыбокае спачуванне паэту Любові Красеўскай з прычыны напаткаўшага яе горя — смерці МАЦІ.

Віцебскае абласное аддзяленне СПБ выказвае глыбокія спачуванні члену Саюза пісьменнікаў Беларусі Міледзію Мікалаевічу Кукуцю ў сувязі з заўчаснай смерцю ДАЧКІ Аксаны.

Выходзіць з 1932 года

Заснавальнікі: Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі», рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"»

Галоўны рэдактар Аляксей Іванавіч ЧАРОТА

Рэдакцыйная калегія: Таццяна Арлова, Алесь Бадак, Дзяніс Барсукоў, Віктар Гардзей, Уладзімір Гніламёдаў, Вольга Дадзіёмава, Жана Запартыка, Анатоль Казлоў, Анатоль Крэйдзіч, Віктар Кураш, Алесь Марціновіч, Вячаслаў Нікіфараў, Мікалай Чаргінец, Іван Чарота, Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі: Юрыдычны адрас: 220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а
E-mail: info@zviazda.by

Адрас для карэспандэнцыі: 220034, Мінск, вул. Захарава,19
E-mail: lim_new@mail.ru
Адрас у інтэрнэце: www.zviazda.by

Тэлефоны: галоўны рэдактар — 325-85-25; намеснікі галоўнага рэдактара — 319-79-85, 224-66-74; адказны сакратар — 377-99-73; аддзел крытыкі і бібліяграфіі — 317-20-98; аддзел прозы і паэзіі — 317-20-98; аддзел мастацтва — 317-20-98; бухгалтэрыя — 311-17-16

Выходзіць раз на тыдзень у пятніцу.

Падпісныя індэксы: 63856 — індывідуальны; 63815 — індывідуальны льготны для настаўнікаў; 638562 — ведамасны; 63880 — ведамасны льготны.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі № 7 ад 10.12.2012, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец: Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"». Дырэктар — галоўны рэдактар Аляксандр Мікалаевіч КАРЛЮКЕВІЧ

Нумар падпісаны ў друк 16.12.2021 у 11.00
Ум. друк. арк. 3,72
Наклад — 639

Друкарня Рэспубліканская ўнітарная прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку» ЛП1 № 02330/106 ад 30.04.2004 г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 79/1. Індэкс 220013

Заказ — 3135

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Рукапісы прымаюцца толькі ў электронным выглядзе (праграма Microsoft Word), не вяртаюцца і не рэцэнзуюцца. Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі аўтараў публікацый. Аўтары нясуць адказнасць за факты, якія прыводзяцца ў публікацыях, у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

ISSN 0024-4686
9 770024 468001 21050